РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 САКАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 54 (30442)

НА ПАРАДКУ ДНЯ – УНУТРАНАЯ І ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

Рабочы тыдзень Прэзідэнта распачаўся з дакладаў прэм'ер-міністра і міністра замежных спраў

(Працяг на 2-й стар.)

ЗЯМЛЯ — У ЗАКОНЕ

Як працуе «зямельная амністыя»

У канцы мінулага года Прэзідэнт Беларусі падпісаў закон, які спрашчае рэгістрацыю зямельных участкаў і здзелкі з імі, а таксама прадоўжыў да 1 студзеня 2028 года так званую зямельную амністыю. Тэма гэта ў беларусаў надзвычай надзённая, бо яшчэ цягам трох гадоў можна будзе па спрошчанай сістэме ўзаконіць самавольна занятыя кавалкі зямлі. А падобных выпадкаў па многіх прычынах (галоўная з якіх — што зямля побач з участкамі руплівых гаспадароў пуставала) у нашых вёсках нямала. І гэта пытанне — менавіта легалізацыя занятай калісьці нікому не патрэбнай на той момант зямлі — для нашых законапаслухмяных людзей надзвычай актуальнае. Прынамсі, на нядаўнім адзіным дні прыёму, які члены Савета Рэспублікі праводзілі ў Мінскай вобласці, «зямельная амністыя» была ў топе самых папулярных зваротаў.



Зямля не павінна пуставаць, яна павінна быць у руплівых гаспадарлівых руках, неаднойчы падкрэсліваў Прэзідэнт. «Я хачу, каб кожны беларус меў гэты кавалак зямлі», — дзяліўся ён сваёй запаветнай марай. Дзеля таго, каб кожны ахвотны мог набыць гэту зямлю, і спрашчаецца на дзяржаўным узроўні заканадаўства.

Аб тым, як працуе «зямельная амністыя» на месцах, высвятлялі нашы карэспандэнты.

СТАР. 7

БУЛЬБА Ў КРАМАХ ЁСЦЬ І БУДЗЕ

6

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 25054

ПРЫЯРЫТЭТЫ

СКАРБЫ ПАД НАГАМІ

Што ў Беларусі робяць з торфу?

Тое, што наша краіна займае першае месца ў свеце па аб'ёме вытворчасці брыкетаў, ужо ні для каго не сакрэт. Справа ў тым, што на тэрыторыі Беларусі запасы торфу ацэньваюцца ў 2,4 мільярда тон, расказаў начальнік аддзела вытворчасці і рэалізацыі тарфяной прадукцыі ўпраўлення тарфяной прамысловасці ДВА «Белпалівагаз» Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ. З гэтых запасаў на перыяд да 2030 года для прамысловай распрацоўкі вызначана 302,1 мільёна тон торфу, або 12 % ад названых запасаў.

СТАР. 12

АФІЦЫЙНА

СТРАХАВАННЕ ПА-НОВАМУ

Што змянілася у страхавым заканадаўстве

18 сакавіка Прэзідэнт падпісаў Указ № 108 «Аб страхаванні». Дакументам прыводзяцца ў адпаведнасць з Законам «Аб страхавой дзейнасці», які ўступіў у сілу 1 студзеня 2025 года, асобныя заканадаўчыя акты, паведаміла БелТА са спасылкай на прэс-службу кіраўніка дзяржавы.

Так, цяпер у адпаведнасці з указам прызнаюцца страціўшымі сілу шэраг указаў (іх асобныя структурныя элементы), палажэнні якіх знайшлі адлюстраванне ў законе. Карэкціруецца выкарыстоўвальная ў прававых актах, у тым ліку ў сумежным заканадаўстве (падатковым, валютным, банкаўскім, у сферах дарожнага руху), тэрміналогія для яе ўзгодненасці з прадпісаннямі закона.

У ліку навацый указа – даванне магчымасці выплачваць страхавыя ўзносы (ажыццяўляць выплаты) у безнаяўнай форме з выкарыстаннем сучасных плацежных сродкаў; устанаўленне ў базавых велічынях (да гэтага былі ў еўра) страхавых сум і памераў страхавых узносаў па абавязковым страхаванні ўладальнікаў транспарту, медыцынскім страхаванні замежных грамадзян, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны.

Акрамя таго, дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў дапаўняецца дзеючым у Беларусі і Расіі дагаворам саюзнага страхавання.

Вызначаецца парадак страхавых выплат пацярпелым у выніку ДТЗ у выпадках, калі перавозчык не заключыў дагавор абавязковага страхавання адказнасці перад пасажырам і немагчыма спагнаць шкоду ў судовым парадку. У выпадкі выплат кіроўцам за кошт сродкаў гарантыйных фондаў дададзена прычыненне шкоды жыццю або здароўю ў выніку ДТЗ з удзелам дзікіх жывёл незалежна ад віны кіроўцы.

Указам дадзена магчымасць ажыццяўлення выплат страхавой кампенсацыі ў адрас нерэзідэнта ў замежнай валюце ў рамках дагавора страхавання грамадзянскай адказнасці рэзідэнта па экспартным кантракце.

Для абавязковага страхавання ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў устаноўлены гранічныя памеры сум, якія могуць быць спагнаны «Белдзяржстрахам» з вінаватых у прычыненні шкоды застрахаваным асобам у лік выплачанага ім страхавога забеспячэння (у выпадку прычынення шкоды наўмысна – 2 тыс. базавых велічынь, ненаўмысна – 500). Спрошчаны ўмовы атрымання страхавальнікам растэрміноўкі па выплаце пратэрмінаваных страхавых узносаў, штрафаў, пеняў.

Указам таксама ўведзены шэраг абмежаванняў па дзейнасці страхавых пасрэднікаў.

«РОСТ ВУП ЁСЦЬ, АЛЕ ХАПАЕ ПЫТАННЯЎ, ЯКІЯ ТРЭБА ВЫРАШАЦЬ, КАБ НЕ ПРАВАЛІЦЬ ГОД»

Прэзідэнт прыняў з дакладам кіраўніка ўрада

У кабінеце Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — першы раз у новым статусе з дакладам прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын. «Ну што, асвоіўся?» — задаў першае пытанне кіраўнік дзяржавы кіраўніку ўрада. Аляксандр Турчын быў прызначаны на гэту пасаду тыдзень таму, але часу на раскачку няма.

Найперш Аляксандр Лукашэнка расказаў прэм'ер-міністру аб сваім афіцыйным візіце ў Расію і перагаворах з Уладзімірам Пуціным.

«Усе пытанні, якія трэба было — і сам-насам, і ў шырокім складзе, асабліва ў шырокім, — мы абгаварылі. І па нафце, і па газе былі дадзены Прэзідэнтам Расіі даручэнні, каб з гэтым разабраліся. У гэтым кірунку трэба проста дапрацаваць гэтыя пытанні, выпрацаваць формулу цэнаўтварэння і гэтак далей», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. Адна з задач ад кіраўніка дзяржавы — «на ўсю катушку падключаць пасольства».

Што да ўнутранага парадку дня, то, як заўважыў Прэзідэнт, рост ВУП ёсць, але і хапае пытанняў, якія трэба вырашаць, каб не праваліць па выніках год: і прырост, і гэтак далей. «У нас прамысловасць і сельская гаспадарка пакуль ідуць з невялікім мінусам, няхай невялікі, але мінус. У Расію таварны экспарт ніжэйшы за мінулы год, гэта насцярожвае вельмі сур'ёзна. І інфляцыя, у чым тут праблема, што ў нас першыя месяцы 2 %?» – адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што пытанне інфляцыі можа быць звязана ў тым ліку з павышэннем у першым квартале кантраляваных цэн. Прэм'ер-міністр таксама нагадаў аб павышэнні цэн на паслугі ЖКГ.

Беларускі лідар звярнуў увагу на яшчэ адно найважнейшае пытанне — формулу справядлівага цэнаўтварэння. «Мы абяцалі народу, што да 1 красавіка формулу гэту выпрацуем, якая ні прадпрымальнікаў, ні вытворцаў і спажыўцоў ціснуць не будзе», — нагадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Турчын свой даклад раздзяліў на два блокі: бягучая сітуацыя і некаторыя канцэптуальныя пытанні па распрацоўцы праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку.

Фота БелТА.

«Па двух месяцах у нас рост ВУП 103,1 %, але, тым не менш, ёсць запаволенні ў параўнанні са студзенем бягучага года. Ёсць аб'ектыўныя прычыны, урад разумее, прымае меры. Нас вельмі непакояць знешнеэканамічная дзейнасць і таварны экспарт у Расійскую Федэрацыю, – далажыў прэм'ер-міністр. – Самая сур'ёзная заклапочанасць – гэта прадукцыя машынабудавання. І тут наша асноўная задача – дыверсіфікацыя экспарту».

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

Неабходна забяспечыць рост эканомікі і не нашкодзіць макраэканамічнай стабільнасці

«Візіт кіраўніка дзяржавы ў Расійскую Федэрацыю, дамоўленасці на самым высокім узроўні і задачы ўрада па рэалізацыі гэтых дамоўленасцяў — гэта пастаянная работа на ўзроўні віцэ-прэм'ераў. Таму ўсё рухаецца ў тых параметрах, якія былі вызначаны», — адзначыў Аляксандр Турчын у размове з журналістамі.

Вельмі важнай работай для ўрада прэм'ер-міністр назваў выпраўленне некаторых дысбалансаў, якія сёння ёсць у эканоміцы. «Гэта трэба зрабіць вельмі акуратна, каб на сабе гэта не адчулі ні суб'екты гаспадарання, ні насельніцтва. Гэта датычыцца цэнавога рэгулявання. Задача пастаўлена – знайсці здаровы баланс, каб, стрымліваючы інфляцыю, не прывесці да пагаршэння эканамічнай сітуацыі для нашых суб'ектаў гаспадарання. Задача Прэзідэнта нязменная – да канца сакавіка мы павінны прыняць рашэнне», – расказаў Аляксандр Турчын.

Прэм'ер-міністр адказаў таксама на хвалюючае грамадства меркаванне аб тым, што, маўляў, цяпер «новы ўрад разам з Нацбанкам надрукуе такую колькасць грошай, што эканоміка рухне, гіперінфляцыя, валютны курс абваліцца»: «Хачу ўсіх заспакоіць, што сёння ва ўрадзе і ў Нацбанку працуюць дастаткова кампетэнтныя людзі, якія разумеюць усе выклікі і пагрозы. Таму задача – збалансаваны эканамічны рост, – сказаў Аляксандр Турчын. – Так, ёсць макраэканамічная стабільнасць і ёсць эканамічны рост. І часам вельмі складана знайсці баланс. Але гэта маё асабістае меркаванне, выбіраючы паміж вялікім ростам і макраэканамічнай стабільнасцю, я выбіраў бы другое». Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што сёння ў краіне дасягнуты высокі ўзровень заработнай платы і трэба захаваць яе рост. «Сёння мы павінны забяспечыць рост нашай эканомікі, ні ў якім разе не нашкодзіўшы макраэканамічнай стабільнасці», – падсумаваў Аляксандр Турчын.

ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ — ПЫТАННЕ НУМАР АДЗІН

Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра замежных спраў

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова. Кіраўнік дзяржавы паставіў шэраг пытанняў перад кіраўніком знешнепалітычнага ведамства.

Першае — будучыя замежныя візіты Прэзідэнта, падрыхтоўка да іх. Другое — дзейнасць у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. Сёлета Беларусь старшынствуе ў органах гэтай арганізацыі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сваім абяцанні сур'ёзна ўглыбіцца ў структуру, колькасць, штатны расклад еўразійскіх камісій для таго, каб вызначыцца па зарплаце і гэтак далей. «Гэта ж будзе лакмусавая паперка для нас. Таму трэба ўглыбіцца і, калі што, параіцца з Мясніковічам (Міхаіл Мясніковіч з 2020 да 2024 года працаваў старшынёй Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі — «Зв.»), у яго ведаў больш, чым у нас усіх у Беларусі, каб памылак не нарабіць, калі будзем уносіць прапановы», — падкрэсліў ён.

Трэцяе — нарада Прэзідэнта з пасламі Беларусі ў замежных краінах. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу падрыхтаваць гэту нараду. «І справаздача МЗС і паслоў па пытаннях знешнеэканамічнай дзейнасці. Гэта пытанне нумар адзін. Яны павінны быць арыентаваны», — даручыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што вельмі важна мець уяўленне, як будзе развівацца супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

«Блізкі Усход, Афрыка — мы шмат пра гэта казалі. Але самае галоўнае — гэта дарожныя карты, гэта планы нашай работы», — абазначыў ён яшчэ адзін кірунак дзейнасці.

У прыклад Прэзідэнт прывёў Аман, які наведваў з афіцыйным візітам у снежні мінулага года. У хуткім часе ў гэту краіну з візітам збіраецца і міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў. Кіраўнік дзяржавы даручыў дакладна вызначыцца, як будзе далей будавацца супрацоўніцтва з гэтай дзяржавай.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

Візіты на высокім узроўні, саміт ЕАЭС, работа паслоў — якія задачы паставіў Прэзідэнт перад МЗС

«Кіраўніком дзяржавы пастаўлены вельмі дакладна задачы па развіцці знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці нашай дзяржавы. Найперш мы абмеркавалі падрыхтоўку да найбольш важных візітаў, якія плануюцца. Гэта візіты або з удзелам кіраўніка дзяржавы, або візіты ў нашу краіну на высокім узроўні», — расказаў міністр журналістам. Сярод такіх візітаў Максім Рыжанкоў вылучыў візіты прэм'ер-міністра Пакістана, прэзідэнта Гвінеі-Бісау, генеральнага сакратара кампартыі В'етнама. Па ўсіх візітах ідзе плённая прадметная падрыхтоўка.

Калі казаць аб мерапрыемствах міжнароднага характару, то тут варта ўзгадаць і падрыхтоўку да саміту Еўразійскага эканамічнага саюза, які пройдзе ў Мінску. «На парадак дня саміту будуць вынесены вельмі важныя пытанні ў адпаведнасці з прыярытэтамі нашага старшынства. Таксама будзе адпрацавана пытанне далейшай аптымізацыі кадравага патэнцыялу дадзенай арганізацыі ў адпаведнасці з даручэннямі, якое дабравольна ўзяў на сябе Прэзідэнт нашай краіны падчас нефармальнага саміту ЕАЭС у Санкт-Пецярбургу», — расказаў міністр.

Што датычыцца нарады з кіраўнікамі дыпмісій, то, па словах Максіма Рыжанкова, падрыхтоўка да гэтага мерапрыемства ідзе вельмі актыўна. «Каб не толькі даць прынцыповую ацэнку дзейнасці кіраўнікоў нашых замежных устаноў (гэта вельмі важна, але не галоўнае). А для таго, каб з удзелам вышэйшых службовых асоб і кіраўнікоў галіновых ведамстваў, буйных прадпрыемстваў крытычна паглядзець на пытанне, што перашкаджае далейшаму развіццю экспартна-імпартных аперацый з нашымі партнёрамі. Разам паглядзець, якія трэба прыняць дадатковыя намаганні, каб нарасціць наш экспарт і канчаткова вырашыць некаторыя пытанні па набыцці Беларуссю крытычнага імпарту, які таксама патрэбны», — удакладніў міністр.

Максім Рыжанкоў расказаў, што ў кабінеце Прэзідэнта разглядаліся кадравыя пытанні дзейнасці МЗС.

АКТУАЛЬНЫ КАМЕНТАРЫЙ

ГАРАНТЫЯ ЗАХАВАННЯ СУВЕРЭНІТЭТУ. І ГЭТА ЎЗАЕМНА

Падчас афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Расію Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяняліся граматамі аб ратыфікацыі Дагавора аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы, які пасля гэтага набыў сілу. Сам факт падпісання гэтага дагавора выклікаў рэзананс, асабліва ў нашых заходніх суседзяў. На самай справе гэта абсалютна лагічны крок у адказ на знешнія выклікі, лічаць эксперты.

— Дакумент ужо ў прэамбуле канстатуе, што бакі «прызнаюць неабходнасць нарошчвання сумесных намаганняў для эфектыўнага рэагавання на сучасныя выклікі і пагрозы ў мэтах умацавання бяспекі бакоў у рамках агульнай абароннай прасторы Саюзнай дзяржавы, — тлумачыць **Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук**. — Ужо ў першым артыкуле адзначаецца, што развіццё двухбаковых адносін у сферы забеспячэння бяспекі не накіравана супраць іншых дзяржаў».

Гэта, праўда, не супакойвае апанентаў. Вельмі бурную рэакцыю нашых «сяброў» выклікала палажэнне аб тым, што бакі разглядаюць узброены напад на дзяржаву — удзельніцу Саюзнай дзяржавы як акт агрэсіі супраць Саюзнай дзяржавы ў цэлым і будуць прымаць адпаведныя меры ў адказ з выкарыстаннем усіх сіл і сродкаў, якія знаходзяцца ў іх распараджэнні, і аб тым, што «ядзерная зброя Расійскай Федэрацыі можа быць прыменена ў адказ на прымяненне супраць любога з бакоў ядзернай зброі або іншых відаў зброі масавага паражэння, а таксама ў выпадку агрэсіі супраць любога з бакоў з прымяненнем звычайнай зброі, якая стварае крытычную пагрозу яго суверэнітэту або тэрытарыяльнай цэласнасці».

Калі апанент хвалюецца, значыць, усё зроблена правільна, падкрэслівае Мікалай Бузін.

Вадзім ГІГІН, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў, у эфіры «Альфа-радыё» патлумачыў, у чым выгада Беларусі ад названага дагавора:

— Беларусь атрымлівае ўнікальныя рэальныя гарантыі бяспекі, якіх не мае ні адна краіна, больш-менш параўнальная з намі па тэрыторыі і насельніцтву. Гэта значыць, напад на нашу краіну будзе расцэнъвацца як напад на Расію. У гэтым няма ні ў кога сумненняў. Размяшчэнне тактычнай ядзернай зброі на нашай тэрыторыі і пратакол яе выкарыстання з удзелам беларускага боку, дзе ёсць і нашы пілоты, і наш персанал, а самае галоўнае — удзел у гэтым рашэнні аб прымяненні ядзернай зброі (не дай бог), — гэта высокая ступень гарантыі. Плюс узбраенне: ракеты СПА, «Іскандэр», размяшчэнне ў Беларусі сістэмы «Арэшнік», якая дазволіць сфарміраваць устойлівую трыяду стратэгічнай бяспекі і стрымлівання патэнцыяльнага праціўніка. Гэта вельмі прадуманы сіметрычны адказ на тыя пагрозы, якія мы бачым уздоўж нашай граніцы, таму што сілы НАТА ў разы перавышаюць нашы, — падкрэсліў дэпутат.

Але не меншую выгаду ад дагавора атрымлівае і Расія, лічыць Вадзім Гігін:

— Гэта ж кантроль над стратэгічным напрамкам не толькі тэрыторыі Беларусі, але і да Балтыі, а то і больш. Тыя сродкі кантролю прасторы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, дазваляюць парыраваць любыя пагрозы на гэтым напрамку, забяспечваюць устойлівы кантроль. А што такое заходні, паўночна-заходні напрамак для Расіі? Гэта Масква, Санкт-Пецярбург, Калінінград — найважнейшыя жыццёвыя напрамкі РФ. Там знаходзяцца органы кіравання. Усё гэта змешчана пад абарону дзякуючы Беларусі. Дарэчы, вось звернем увагу на абаронна-прамысловы комплекс: шасі ў «Арэшніка» чыё? Беларускае. Гэта толькі адзін факт, а такіх прыкладаў кааперацыі шмат. Гэта ўнікальны прыклад, які датычыцца бяспекі... Мы з Расіяй размаўляем на роўных, сінхранізуем многія працэсы. Гэта прыклад для многіх.

НАЙНОЎШАЯ ГІСТОРЫЯ

«ВЕДАЎ, ШТО РОБІЦЬ, КАЗАЎ ПРАЎДУ, І ЛЮДЗІ ЯМУ ВЕРЫЛІ, ІШЛІ ЗА ІМ»

35 гадоў назад Аляксандр Лукашэнка стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР

Падчас выступлення Прэзідэнта Беларусі ў Савеце Федэрацыі ў Маскве старшыня Савета Федэрацыі Валянціна Матвіенка павіншавала Аляксандра Лукашэнку з пачаткам яркай палітычнай кар'еры. У сакавіку 1990 года, а дакладней 18 сакавіка, дырэктар саўгаса «Гарадзец» Шклоўскага раёна Аляксандр Лукашэнка падчас паўторнага галасавання (барацьба за мандаты была сур'ёзная: на 310 месцаў прэтэндавала 1427 кандыдатаў) стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У адказ Прэзідэнт Беларусі заўважыў: «Было такое. І вельмі гэтым ганаруся. Калі б гэтага перыяду, як і іншых, не было ў маім жыцці, я б, можа, і не быў Прэзідэнтам. Самы галоўны мой перыяд у жыцці — дэпутацкая работа. Я бачыў усіх, я бачыў усё, і я там навучыўся высокім тэхналогіям — палітычным, дыпламатычным і іншым — і як губка гэта ўсё ўбіраў. За той перыяд мне не сорамна»...

Аляксандр ЛУКАШЭНКА, народны дэпутат Беларусі:

«ДАТЭРМІНОВЫЯ ВЫБАРЫ – НЕ ПАНАЦЭЯ. МАГЧЫМЫ ІНШЫЯ ВАРЫЯНТЫ ВЫЙСЦЯ З КРЫЗІСУ»

Народны дэпутат Лукашэнка заўсёды шукаў выйсце з крызісу. «Звязда» 18 лістапада 1993 года, № 213.

Як звярнуў увагу **старшыня Пастаянай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ,** палітычная кар'ера Аляксандра Лукашэнкі пачалася значна раней, чым 18 сакавіка 1990 года, калі ён быў выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Сенатар удакладніў, што палітычнай работай кіраўнік дзяржавы пачаў займацца яшчэ будучы камсамольскім работнікам, афіцэрам палітупраўлення, кіраўніком прадпрыемства.

Аднак найбольш яскрава лідарскія якасці Аляксандра Лукашэнкі, па словах парламентарыя, праявіліся ў перыяд яго дэпутацкай работы. «Людзі старэйшага ўзросту глядзелі тэлебачанне (ішлі прамыя рэпартажы з залы пасяджэнняў): усе яны хацелі чуць смелыя, адкрытыя, прагрэсіўныя выступленні маладога дэпутата Вярхоўнага Савета Аляксандра Лукашэнкі, — канстатаваў сенатар. — Яго выступленні адрозніваліся рацыяналізмам, смеласцю. Ён мог смела выказаць любы пункт гледжання, данесці пры разглядзе законапраекта пастулат — гэты закон трэба прымаць ці не трэба, чаму не трэба, закон прынясе карысць або шкоду. Дзякуючы сваім лідарскім якасцям, абгрунтаванасці і сістэмнасці, у Аляксандра Лукашэнкі адкрылася вялікая перспектыва як палітычнага лідара».

Міхаіл Русы падкрэсліў, што шлях дэпутата — вялікая школа жыцця. «Яна прывучыла да сістэмнасці, дэталёвай прапрацоўкі кожнага закона, бо за гэтым стаяць лёсы людзей, прадпрыемстваў і лёс краіны, — заўважыў сенатар. — Прэзідэнт патрабуе гэтага і сёння. На працягу 31 года патрабуе, каб кожны закон быў якасны, прадуманы. Гэта дапамагае, прымушае нас весці эфектыўную работу, бо асноўнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы — справядлівасць. Справядлівасць ва ўсім: справядлівыя адносіны, справядлівыя рашэнні і справядлівыя цэны».

Пра Аляксандра Лукашэнку як пра дэпутата загаварылі ўжо ў 1991 годзе, калі ён стаў адзіным чалавекам у парламенце, які не стаў галасаваць за распад СССР, згадаў у эфіры «Альфа-радыё» **дэкан факультэта журналістыкі БДУ, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ:**

— Потым пра яго загаварылі ў пачатку 90-х, калі ён узначаліў камісію па барацьбе з карупцыяй і правёў некалькі яркіх выступленняў. Я памятаю, што тады дзівіўся: як такі малады чалавек не баіцца кінуць выклік супольнасці? Ён расследаваў карупцыйныя праявы ўнутры дэпутацкага асяроддзя, выносіў абвінавачанні старшыні Вярхоўнага Савета Станіславу Шушкевічу і не баяўся гэтага. А яго выступленні былі рынцыповымі і жорсткімі, таму прыцягвалі ўвагу. Мы ведаем, што пазней гэта адыграла вялікую ролю ў яго прэзідэнцкай кампаніі.

Дэкан факультэта журналістыкі БДУ дадаў, што літаральна за некалькі гадоў Аляксандр Лукашэнка здолеў медыйна раскруціцца пры тым узроўні развіцця медыя, калі існавалі толькі газеты і тэлебачанне.

— Але чалавек змог стварыць сабе медыйны вобраз бескампрамісна-барацьбіта за народныя інтарэсы літаральна за некалькі гадоў. Бо потым, у 1994 годзе, ён з шумам выйграў прэзідэнцкія выбары. Усе яго сапернікі аказаліся на задніх ролях. І гэта пры актыўным супрацьдзеянні, якое ніхто не хаваў, і спробах выцесніць Аляксандра Лукашэнку з перадвыбарнай кампаніі. Аднак чалавек ведаў, што робіць, казаў праўду, і людзі яму верылі, ішлі за ім.

Самае галоўнае — пазней наш Прэзідэнт ні разу не адступіў ад сваіх слоў, не падмануў, як многія іншыя палітыкі. Пры гэтым і першапачаткова ён выглядаў як чалавек, які разумее, што нельга ўсё рэзка мяняць, кідацца з боку ў бок. Увесь шлях, пачынаючы ад дэпутата і да сённяшняга дня, знаходзячыся на пасадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ён не падмануў сваіх выбаршчыкаў, сапраўды працуе на карысць краіны і грамадзян.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. (www.cpo.by)
Продавец	ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, руб.
1	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8176-7, 2014 г. в.	27 716,75
2	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8243-7, 2014 г. в.	27 716,75
3	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АС 0213-7, 2014 г. в.	27 716,75
4	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK-19277-01, рег. знак АР 8280-7, 2014 г. в.	27 848,17
5	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8177-7, 2014 г. в.	27 849,56
6	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8275-7, 2014 г. в.	27 820,74
7	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АС 0228-7, 2014 г. в.	27 797,44
8	VOLKSWAGEN CADDY RYCAR 29454, рег. знак 9390 CI-7, 2010 г. в.	9 859,09
9	VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK-19277-01, рег. знак АО 2448-7, 2014 г. в.	27 778,84
10	VOLKSWAGEN CADDY RYCAR 29454, рег. знак АС 0156-7, 2010 г. в.	9 917,68
11	VOLKSWAGEN TRANSPORTER, рег. знак АР 8200-7, 2008 г. в.	11 439,01
12	FORD TRANSIT INDEEC 29459-04, рег. знак АС 0218-7, 2012 г. в.	11 968,94
13	FORD TRANSIT VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АР 8178-7, 2010 г. в.	12 491,16
14	FORD CONNECT INDEEC 294591-01, рег. знак АР 9557-7, 2011 г. в.	8 381,30

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–8 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в «Звязда» 18.02.2025

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 31.03.2025 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» на праве хозяйственного ведения** (Продавец).

Электронные торги состоятся 21.04.2025

Лоты №№ 1 – 58: кресло для актового зала.

Полный перечень с инвентарными номерами размещен на электронной торговой площадке «GOSTORG».

Начальная цена с НДС 20 %:
Лотов №№ 1–49 – 216,00 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 50–53 – 276,00 руб. (за один Лот),
Лотов №№ 54–58 – 144,00 руб. (за один Лот).
Местонахождения Лотов №№ 1–58: г. Минск, ул. М. Богдановича, 153.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

Организатор электронных торгов:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• e-mail: torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ І ДАБРАБЫТ НАРОДА

Пытанні дэмаграфічнай бяспекі абмеркавалі на пасяджэнні экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі

Тэмы, якія абмяркоўваюцца ў такім фармаце, з удзелам шырокага кола экспертнай супольнасці, заўсёды актуальныя, бо датычацца жыццядзейнасці нашай краіны. Напрыклад, летась у Любанскім райвыканкаме комплексна ўзнімалася пытанне практычнага прымянення заканадаўства, рэалізацыі мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель і іх эфектыўнага выкарыстання. У гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна на разгляд выносілася пытанне ўстойлівага развіцця рэгіёнаў на аснове стварэння імпартазамяшчальных і кааперацыйных вытворчасцяў, актыўнага выкарыстання механізмаў іх фінансавай падтрымкі.

Тэма чарговага выязнога пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі, якое прайшло на базе Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі, — «Дэмаграфічная бяспека ў Рэспубліцы Беларусь: тэндэнцыі, выклікі, перспектывы» — таксама носіць практычны аспект.

АД ВОДПУСКУ ПА ДОГЛЯДЗЕ ДЗІЦЯЦІ ДА БЯСПЛАТНЫХ ПАДРУЧНІКАЎ

Як звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** гарантаванне дэмаграфічнай бяспекі з'яўляецца адным з найважнейшых складнікаў эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця любой дзяржавы. Яна падкрэсліла, што ў Беларусі пытанні дэмаграфічнай палітыкі, уключаючы развіццё чалавечага капіталу, падтрымку сям'і, абарону мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, знаходзяцца на пастаянным кантролі кіраўніка дзяржавы.

У гэтай сувязі спікер нагадала выступленне Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 31 сакавіка 2023 года, у якім Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Каб моцна стаяць на сваёй зямлі, нас, беларусаў, мусіць быць больш, значна больш. Гэта найважнейшая ўмова суверэнітэту. І дзяржава робіць шмат, каб гэту ўмову забяспечыць».

Дзяржаўнай праграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2021—2025 гады прадугледжаны мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне здароўя, павелічэнне нараджальнасці і чаканай працягласці жыцця, фарміраванне здаровага ладу жыцця, арыентацыю выхаваўчага і адукацыйнага працэсу на сямейныя каштоўнасці і павышэнне прэстыжу шматдзетнай сям'і, паляпшэнне сацыяльна-эканамічных умоў жыццядзейнасці насельніцтва.

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на тым, што ўмацаванне статусу сям'і і папулярызацыя традыцыйных каштоўнасцяў, падтрымка мацярынства, бацькоўства і дзяцінства з'яўляецца непарушным нацыянальным прыярытэтам Беларусі.

«Па даных сацыялагічнага даследавання па пытаннях фарміравання сям'і, стабільнасці сямейных адносін і нараджальнасці ў зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах жыцця беларусаў, большасць жыхароў нашай краіны лічаць, што няма нічога важнейшага за мацярынства і бацькоўства, а сярэднестатыстычны беларус марыць аб сям'і з двума-трыма дзецьмі, — адзначыла Наталля Качанава. — Тое, што хатні ачаг важны для нашых людзей, пацвярджае і апошні перапіс насельніцтва. Сёння двое малышоў ёсць у кожнай трэцяй сям'і. Амаль на 70 % стала больш шматдзетных сем'яў — іх у нас цяпер больш за 123 тысячы, з іх 80 % — з трыма дзецьмі».

ЗАХАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ: ЗАКАНАДАЎЧЫЯ МЕХАНІЗМЫ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ

Дзякуючы прынцыповай палітыцы, замацаванай на ўзроўні Канстытуцыі, Беларусь адстойвае традыцыйныя каштоўнасці. «Іх умацаванне і папулярызацыя заўсёды былі і застаюцца ў ліку ключавых кірункаў заканатворчай дзейнасці Савета Рэспублікі, — канстатавала спікер. — Выходзячы ў тым ліку з гэтых пазіцый, былі прыняты новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі, якая ўзмацняе выхаваўчы кампанент, Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі», змяненні ў Закон «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», якія пашыраюць магчымасці ўдзелу моладзі ў грамадска значнай дзейнасці».

З мэтай удасканалення заканадаўства, якое рэгулюе пытанні шлюбных і сямейных адносін, дзяржаўнай абароны дзяцей і сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна неабароненым становішчы, летась былі прыняты законы «Аб змяненні законаў па пытаннях рэгулявання шлюбных і сямейных адносін» і «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», а таксама ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на прадаўжэнне праграмы сямейнага капіталу да 2030 года і пашырэнне магчымасцяў датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу.

Савет Рэспублікі актыўна ўцягнуты і ў работу па пытаннях захавання і памнажэння сямейных каштоўнасцяў. Праведзены выязныя пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі па пытаннях фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму ў студэнцтва, па тэме грамадска-дзяржаўнага партнёрства ў вырашэнні праблем п'янства і алкагалізму, тэматычныя круглыя сталы. Два гады запар арганізоўваецца і праводзіцца «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» — сумесная ініцыятыва Савета Рэспублікі і Беларускай праваслаўнай царквы, прысвечаная ўмацаванню статусу сям'і і папулярызацыі традыцыйных каштоўнасцяў.

«ЖЫЦЦЁВЫ ПОСПЕХ І ДОСВЕД БЕССЭНСОЎНЫЯ, КАЛІ ІХ НЯМА КАМУ ПЕРАДАЦЬ»

Разам з тым тэндэнцыі апошніх гадоў, як заўважыла Наталля Качанава, указваюць на рызыкі, якія захоўваюцца ў дэмаграфічнай сферы. «Гэта характэрна для ўсіх развітых краін, — дадала яна. — Сярод іх — зніжэнне нараджальнасці, старэнне насельніцтва, міграцыйныя працэсы, рост колькасці траўматызму і смяротнасці ад няшчасных выпадкаў, змяненне структуры каштоўнасных арыенціраў. Калі мы гаворым аб насельніцтве нашай краіны, аб яго колькасці, то ў першую чаргу звяртаем увагу на пытанні павышэння ўзроўню нараджальнасці, стварэння сям'і, захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Для насельніцтва Рэспублікі Беларусь характэрны высокі ўзровень свядомага планавання сям'і і нараджэння дзяцей. У той жа час каля трэці сем'яў не рэалізоўвае свае рэпрадуктыўныя функцыі ў поўнай меры».

Па яе словах, гэта звязана са змяненнем жыццёвых прыярытэтаў маладых людзей. Як правіла, яны адкладаюць стварэнне сям'і і нараджэнне дзяцей, засяродзіўшыся на кар'еры і самарэалізацыі. «Усё часцей нашы маладыя жанчыны становяцца маці ў больш познім узросце, што негатыўна адбіваецца на колькасці нованароджаных, — дадала спікер. — Сярэдні ўзрост мацярынства і бацькоўства ў Рэспубліцы Беларусь пастаянна павялічваецца. У 2024 годзе ўзрост маці пры нараджэнні першага дзіцяці склаў 27 гадоў».

Старшыня Савета Рэспублікі засяродзіла ўвагу на адным з выклікаў, які навязваецца звонку, — навамоднай субкультуры «чайлдфры», сутнасць якой — у свядомым нежаданні нараджаць і выхоўваць дзяцей. «Як гаворыць наш Прэзідэнт, парадыгму такога мыслення трэба мяняць, — нагадала спікер. — Ёсць рэчы, якія маладыя людзі проста не могуць зразумець у сілу свайго ўзросту. Але мы, старэйшае пакаленне, можам і павінны своечасова патлумачыць, што жыццёвы поспех і досвед бессэнсоўныя, калі іх няма каму перадаць. Любая папулярызацыя ідэй бяздзетнай сямейнай пары ў нашай інфармацыйнай і культурнай прасторы недапушчальная».

«МОЦНАЯ СЯМ'Я — У ДАЛЕЙШЫМ МОЦНАЯ КРАІНА»

Не менш важнымі, па словах Наталлі Качанавай, з'яўляюцца пытанні павелічэння працягласці жыцця насельніцтва, зніжэння ўзроўню смяротнасці і інваліднасці, захавання і ўмацавання рэпрадуктыўнага здароўя мужчын і жанчын, даступнасці і якасці аказання медыцынскіх паслуг.

«За гады суверэнітэту нашай краіны ў сістэме аховы здароўя зроблена вельмі шмат, — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта і ахоп установамі аховы здароўя, і створаныя скрынінгавыя і рэабілітацыйныя цэнтры, якія дазваляюць выяўляць захворванні на ранніх стадыях, і ўкараненне ў арганізацыях аховы здароўя новых метадаў прафілактыкі, дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі захворванняў, — канкрэтызавала яна. — Але спыняцца на дасягнутым ні ў якім разе нельга».

Спікер падкрэсліла, што ў цэнтры дзяржаўнай палітыкі нашай краіны быў, ёсць і будзе чалавек. «Сёння дзяржавай прыняты шырокі шэраг мер па паляпшэнні сітуацыі ў дэмаграфічнай сферы: ад арганізацыйна-фінансавых да асветніцкіх, — адзначыла Наталля Качанава. — Разам з тым гэта пытанне працягвае заставацца ў зоне павышанай увагі і патрабуе пастаяннай выпрацоўкі новых рашэнняў, накіраваных на стабілізацыю і паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі, павышэнне нараджальнасці, умацаванне інстытута сям'і і шлюбу, бо моцная сям'я — гэта ў далейшым моцная краіна».

Рэзюмуючы, Наталля Качанава падкрэсліла, што ў пытанні паляпшэння сітуацыі ў першую чаргу неабходна звярнуць увагу на зладжанасць дзеянняў па забеспячэнні дэмаграфічнай бяспекі ўсіх удзельнікаў, задзейнічаных у вырашэнні дадзеных задачы. «Прадстаўнікам выканаўчай і заканадаўчай галін улады, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзянам як ніколі трэба дзейнічаць разам, — канкрэтызавала спікер. — Толькі разам мы зможам захаваць і прымножыць непарушныя пастулаты беларускай дзяржавы, дзе на чале ўсяго — нацыянальныя інтарэсы і дабрабыт народа».

З дакладамі па тэме пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета выступілі міністры аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, кіраўнік Цэнтра чалавечага развіцця і дэмаграфіі Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук, намеснік старшыні Вярхоўнага Суда.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов:
бывшее в употреблении имущество.
Местоположение –
Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово 42/2

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Автомобиль MAZ 6501A8-325-000,** 2013 г. в.	**23 160,00**
2	**Прицеп MAZ 856103-(010), А 8286 В-5,** 2013 г. в.	**11 640,00**
3	**Прицеп MAZ 856103- (010), А 8287 В-5,** 2013 г. в.	**11 640,00**

Цена снижена на 50 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	**10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 28.02.2025

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 12.00 01.04.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **31.03.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	ООО «Адельвейс», Минская обл., Минский р-н, аг. Атолино, пер. Первомайский, д. 1А, каб. 4. УНП 190092589
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов –
имущество, бывшее в употреблении

Вилочный погрузчик ТОЙОТА 7FGL 15,
номер 17322, 2001 г. в.
Адрес: Минский р-н, аг. Атолино, пер. Первомайский, д. 1А

Начальная цена лота с НДС 20 % – 24 300,00 бел. руб.
Шаг электронных торгов составляет 5 % от текущей цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона
Условия оплаты предмета электронных торгов	В течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 6 % от итоговой цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 12.00 21.04.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by

ВАЖКАЯ ПАДТРЫМКА

Як выкарыстоўваецца сямейны капітал у Беларусі?

Паводле інфармацыі Мінпрацы і сацабароны, на 1 студзеня 2025 года для шматдзетных сем'яў быў адкрыты 144 581 дэпазітны рахунак «Сямейны капітал», у прыватнасці, 82,6 тысячы дэпазітных рахункаў на суму 826 млн долараў ЗША і 61,9 тысячы дэпазітных рахункаў на суму 1,6 млрд рублёў.

Як патлумачылі ў профільным міністэрстве, па стане на 1 сакавіка 2025-га на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена 93 306 заяў. З іх на мэты паляпшэння жыллёвых умоў — 75 258, на атрыманне медыцынскіх паслуг — 10 260, на атрыманне адукацыі — 7781, на набыццё тавараў для інвалідаў — 7.

Прынята 90 504 рашэнні аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу, з іх большасць прыходзіцца на Брэсцкую вобласць — 19 114, далей ідуць Мінская вобласць — 15 670, Гомельская — 14 407, Мінск — 12 805, Гродзенская вобласць — 10 723, Магілёўская — 9147 і Віцебская вобласці — 8638.

Нагадаем, што сямейны капітал прызначаецца шматдзетным сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступнага дзіцяці.

Дарэчы, з 1 студзеня 2025 года памер сямейнага капіталу складае 33 275 рублёў. У такім памеры сямейны капітал прызначаецца сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей у перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2025 года.

ЯКАСНЫ ПАДЫХОД

Мінпрам завяршае распрацоўку стратэгіі развіцця станкабудаўнічай галіны на перыяд да 2030 года

Мэта дакумента — фарміраванне прыярытэтных кірункаў развіцця галіны, стварэнне ўмоў для тэхналагічнай незалежнасці ў вытворчасці фондаўтваральных актываў, якія забяспечваюць сродкамі вытворчасці прадпрыемства, патлумачылі ў профільным міністэрстве.

Так, у стратэгіі будуць прадстаўлены асноўныя мэты і задачы развіцця станкабудаўнічай галіны краіны на найбліжэйшую пяцігодку, праведзены аналіз стану і праблемных пытанняў станкабудавання, ацэнена разнастайнасць, узровень якасці і кошт станочнай прадукцыі і камплектуючых, якія вырабляюцца ў Саюзнай дзяржаве і далёкім замежжы. Асобна будзе вызначана роля падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі галіновых інжынерных і навуковых кадраў у дасягненні мэт развіцця інструментальнай вытворчасці і прапанаваны мерапрыемствы па ўдасканаленні кадравай палітыкі.

Станкабудаванне Беларусі з'яўляецца неад'емнай часткай машынабудаўнічай і металаапрацоўчай прамысловасці, забяспечваючы колькаснае і якаснае развіццё гэтых і іншых галін, адыгрываючы важную ролю ў абнаўленні тэхналагічнага парка краіны.

— Беларускія станкабудаўнічыя прадпрыемствы валодаюць шэрагам унікальных характарыстык і кампетэнцый, якія даваляюць ім канкурыраваць на міжнароднай арэне. Высокая якасць прадукцыі, інавацыйныя распрацоўкі, а таксама значны экспартны патэнцыял з'яўляюцца ключавымі перавагамі беларускага станкабудавання, — зрабілі акцэнт у Мінпраме.

Дарэчы, цяпер у Беларусі працуюць каля 30 арганізацый — вытворцаў металаапрацоўчага абсталявання як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці.

— Гэта станкабудаўнічыя і інструментальныя заводы, прадпрыемствы па вытворчасці ўніверсальнага тэхналагічнага абсталявання, кавальска-прэсавага і ліцейнага абсталявання, спецыяльныя канструктарскія бюро і навукова-даследчыя канструктарска-тэхналагічныя інстытуты, — патлумачылі ў профільным міністэрстве. — Наменклатура станкоў, якія на іх вырабляюцца, ахоплівае ўсе дзевяць груп па прынятай у станкабудаванні класіфікацыі і дазваляе задаволіць базавыя тэхнічныя патрэбы прадпрыемстваў розных галін. Акрамя прадукцыі для металаапрацоўкі, станкабудаўнічыя заводы выпускаюць і іншае абсталяванне, спажывецкія тавары, запасныя часткі, інструмент і іншае.

Напрыканцы адзначым, што асноўныя вытворцы металаапрацоўчых станкоў уваходзяць у сістэму Міністэрства прамысловасці. Сярод вядучых станкабудаўнічых прадпрыемстваў краіны — такія акцыянерныя таварыствы, як «Кузлітмаш», «Гомельскі завод станкоў і вузлоў», станказавод «Чырвоны барацьбіт», «Станкагомель», «ВІСТАН», станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава, Мінскі завод аўтаматычных ліній імя Машэрава і іншыя.

ПЛЮС У КАШАЛЬКУ

Даходы беларусаў за год павялічыліся на 13 %

Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва Рэспублікі Беларусь у студзені 2025 года склалі 113,8 % да ўзроўню студзеня 2024-га. Аб гэтым паведамляе Белстат у сваім тэлеграм-канале.

У статыстычным ведамстве патлумачылі, што ў агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 64,9 %, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя) — 22,2 %, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 7,7 %, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 5,2 %.

Адзначым, што грашовыя даходы прадстаўлены за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэкціраваны на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі.

ДЫК ШТО ТАМ З БУЛЬБАЙ У КРАМАХ?

МАРГ сцвярджае: ёсць практычна ва ўсіх

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ва ўзаемадзеянні з аблвыканкамамі, Мінскім гарадскім, раённымі выканаўчымі камітэтамі праводзяць кантрольныя мерапрыемствы ў аб'ектах гандлю па пытанні выканання заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў пры рэалізацыі бульбы.

У профільным міністэрстве расказалі, што за мінулы тыдзень такія мерапрыемствы праведзены ў 437 аб'ектах гандлю. У трох працэнтах аб'ектаў бульба адсутнічала (са спасылкай на тое, што машына з прадукцыяй была ў дарозе, тавар быў вернуты пастаўшчыку з прычыны нізкай якасці і г. д.). У 10 працэнтах аб'ектаў для рэалізацыі прапаноўвалася бульба, якая не адпавядае патрабаванням заканадаўства (з механічнымі пашкоджаннямі, мокрая, з кальцавой гнілатой, пазелянелая на плошчы больш за 1/4 паверхні, дробнай каліброўкі і іншыя).

Дарэчы, згодна з патрабаваннямі ДАСТ дыяметр клубняў бульбы павінен быць не меншы за 35 і не большы за 80 мм.

— Суб'ектам, якія дапусцілі парушэнні заканадаўства, выдадзены рэкамендацыі аб іх ліквідацыі, няякасная прадукцыя канфіскавана з рэалізацыі. МАРГ працягне кантроль за дзейнасцю гандлёвых сетак, — рэзюмавалі ў профільным міністэрстве.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
19 сакавіка 2025 г. № 10 (791)

ЗЯМЛЯ — У ЗАКОНЕ

У ЧАРЗЕ НА «АМНІСТЫЮ»

У Магілёўскім раёне больш як паўтысячы чалавек звярнуліся, каб легалізаваць сваю маёмасць. Тое, што парушальнікаў хапае, — факт неаспрэчны. Па інфармацыі ўпраўлення землеўпарадкавання Магілёўскага райвыканкама, толькі ў раёне іх болей за тысячу...

Землеўпарадчыкі райвыканкама сведчаць, што, нягледзячы на іх намаганні, справы з легалізацыяй самавольна занятай зямлі рухаюцца не вельмі хутка. З тысячы парушальнікаў зямельнага заканадаўства з моманту дзеяння «зямельнай амністыі» звярнулася ўсяго палова. Найбольшая колькасць зваротаў паступіла ад жыхароў Кадзінскага сельсавета — на 10 сакавіка іх было 52.

Прыём зацікаўленых грамадзян вядзецца ў сельсавеце кожны чацвер, менавіта па такім графіку працуюць землеўпарадчыкі з райвыканкама. Але летам, калі адбываецца наплыў насельніцтва, колькасць такіх прыёмаў павялічваецца.

— Калі прывязкі да спадарожнікавай здымкі, якую цяпер праводзіць «Белгіпразем», не было, людзі ўводзілі гаспадарчыя пабудовы без аглядкі на межы свайго ўчастка і спадзяваліся, што гэта ніхто не заўважыць, — кажа **старшыня Кадзінскага сельсавета Андрэй ШАРОЎ.** — Калі нехта з суседзяў пачынаў скардзіцца на самавольства або парушэнні выяўляліся іншым чынам, пабудову зносілі. Дзяржава дала магчымасць легалізаваць пабудовы. Плаці грошы і ўзаконьвай сваю маёмасць. Нехта сцяну дома сабе перасунуў, лазню або павець пабудаваў — прыкладаў хапае. Разам з землеўпарадчыкамі выязджаем па адрасах, каб ацаніць памеры самабудоў, выявіць парушэнні іншых норм. Ва ўсім павінен быць парадак.

Кошт паслугі па легалізацыі залежыць ад месца знаходжання ўчастка і яго кадастравага кошту. Укладваць грошы ў пустэчу, вядома, няма сэнсу. Але, калі ўчастак або пабудова паспяхова выкарыстоўваюцца, іх, бясспрэчна, трэба ўзаконіць, каб потым не было ніякіх пытанняў. Дэпутаты нагадваюць пра гэта на сельскіх сходах, адзіных днях дэпутата, іншых сустрэчах.

— Закон дзейнічае трэці год, а ўсё роўна знаходзяцца людзі, якія пра яго не ведаюць, — гаворыць **старшыня Магілёўскага райсавета Сяргей ЯРОШЧАНКА.**

— Неяк прыйшла на прыём грамадзянка і, ледзь не плачучы, прасіла дапамогі, каб легалізаваць неўзаконеныя метры. Калі даведалася, што такая магчымасць існуе, вельмі ўзрадавалася, прызналася, што нават не чула пра закон.

Наогул, людзям вельмі пашчасціла, што такая магчымасць ёсць. Не трэба звяртацца ў суд, адказваць перад законам за самавольны захоп зямлі — пішы заяву і афармляй сваю маёмасць.

Семукацкі сельсавет — самы аддалены ў Магілёўскім раёне, тут з легалізацыяй зямлі праблем няма. За ўвесь час дзве такія заявы было.

— Нядаўна звярнуліся людзі, каб узаконіць гараж, які на два метры выйшаў за межы іх участка, — прыводзіць прыклад **старшыня сельсавета Тамара УКРУЖСКАЯ.** — Мы дапамаглі сфарміраваць заяўку і сабраць неабходны пакет дакументаў. Чакаем землеўпарадчыкаў, каб яны правялі замеры і выдзелілі дадатковыя метры.

Плюс «зямельнай амністыі» ў іншым, лічыць суразмоўніца. Дзякуючы ёй больш за дзясятак дамоў на тэрыторыі сельсавета атрымалі статус жылых і болей як 200 зямельных участкаў набылі афіцыйны статус.

— Яны ўжо значыліся ў пагаспадарчых кнігах, але не былі аформлены яшчэ з савецкіх часоў, — кажа старшыня сельсавета. — Пры сумеснай рабоце з райвыканкамам па выяўленні самавольна занятых зямельных участкаў гэта высветлілася. Разам абышлі кожны населены пункт і папярэдзілі ўсіх, каго гэта датычылася. Пытанні па афармленні былі аператыўна вырашаны.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«КАЛІ МАЮ ПРАВА, ТО Я ЯГО РЭАЛІЗУЮ»

Старшыня Азяцкага сельвыканкама Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці, у які ўваходзіць 11 населеных пунктаў, Алена ЗІНКЕВІЧ расказала, што вырашэннем праблем па так званай «зямельнай амністыі» зацікавіліся многія вясковыя жыхары. У асноўным людзі хочуць узаконіць участкі зямлі, якімі яны карысталіся шмат гадоў.

— Так склалася гістарычна, што, напрыклад, бацькі грамадзяніна К., а можа, яшчэ і яго дзед з бабуляй садзілі на гэтым участку бульбу, сеялі збожжавыя. Зямля гадамі апрацоўвалася, але ні ў якіх дакументах не значылася за гэтай сям'ёй. Бо раней жа толькі 25 сотак дазвалялася запісваць ва ўчастак пры жылым доме. Вось і звяртаецца названы грамадзянін у сельвыканкам з заявай. Мы яе прымаем, далей прыязджаюць спецыялісты землеўпарадкавальнай службы, праводзяць абмеры, вызначаюць кадастравы кошт зямлі. І пасля аплаты намі прымаецца канчатковае рашэнне, на падставе якога грамадзянін можа звярнуцца ў агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры па атрыманне дакумента на права валодання ўказанай зямлёй.

Зямля ў названым сельсавеце мае попыт, відаць, яшчэ і таму, што аграгарадок Азяты размешчаны недалёка ад райцэнтра, а таксама — ад Кобрына і Брэста. Вось і ў мінулым годзе брастаўчанін купіў старую хату з участкам, потым падаў заяву, узяў у арэнду гектар зямлі пад вырошчванне клубніц, аформіў вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі. Яму выдзелілі пустку, што гадамі зарастала травой ды дробным кустоўем. Новы гаспадар зямлю апрацаваў, прывёў у парадак і ўжо высадзіў расаду ягад.

Кіраўнік мясцовай улады лічыць, што дзякуючы падпісанаму нядаўна закону многія больш уважліва паставіліся да пытанняў афармлення зямельных участкаў. «Напрыклад, у нас ёсць людзі, якія купілі дамы ў Азятах. Папярэднімі ўласнікамі жылля былі грамадзяне краін блізкага замежжа, — расказвае старшыня сельскага Савета. — Паводле закона, замежнікам прадаецца ва ўласнасць толькі жылы дом, а зямля на ўчастку перадаецца ў арэнду. На такіх умовах яны і прадалі свае сядзібы нашым грамадзянам. Але нашы людзі пачалі звяртацца з заявамі, каб перавесці ўчасткі з арэнды ва ўласнасць».

Як сказала аўтарам гэтых радкоў жыхарка Азятаў Святлана С., дом, які яна набыла летась, належаў раней грамадзяніну Казахстана: «Пры здзяйсненні здзелкі мне таксама афармілі ўчастак зямлі пры доме ў арэнду. Але ж я грамадзянка Беларусі і хачу жыць па нашых законах. Калі маю права на гэты кавалак зямлі, то і рэалізую яго. Падала заяву ў сельсавет, а яны ўжо перадалі яе далей па інстанцыях. Працэдура гэтая бясплатная. Мне застанецца толькі заплаціць за новае пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі. Хоць, на мой погляд, такі пераход маглі б праводзіць адразу аўтаматычна пры набыцці дома з участкам грамадзянінам нашай краіны. Можа, так і будзе ў далейшым. Заканадаўства ж мяняецца, удасканальваецца».

«ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ — ТРЭБА РАБІЦЬ»

«Часцей за ўсё людзі да нас звяртаюцца з сітуацыямі, калі пры будаўніцтве на зямельным участку, прадстаўленым раней ці нядаўна, недзе памыліліся, не разлічылі правільна і паставілі капітальны будынак з парушэннем мяжы свайго ўчастка».

Аб практыцы работы з насельніцтвам у гэтым кірунку распавяла **старшыня Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна Жанна БІЗНЯ:** «У кагосьці вылез вугал альтанкі, гаража ці іншай гаспадарчай пабудовы. Даволі часта ў нас людзі хочуць узаконіць капітальныя агароджы, якія ўстаноўлены з парушэннем межаў», — патлумачыла кіраўнік сельскага Савета.

— Сярод тых, хто да нас ужо звярнуўся па зямельнай амністыі, пераважная большасць людзі, якія хочуць легалізаваць факт частковага самавольнага заняцця. Усе канкрэтныя выпадкі разглядаюцца індывідуальна, — падкрэсліла Жанна Бізня. — Людзей інфармуем, што галоўная ўмова, каб іх выпадак самавольнага заняцця зямельнага участка быў разгледжаны, — сам факт яго заняцця павінен быць не пазней за 1 верасня 2022 года. У тым ліку гэты факт мусіць быць пацверджаны.

— У нас ёсць выпадкі, калі ў ранейшыя гады пры афармленні дакументаў на зямлю людзям усталёўвалі межы ўчастка па прамой з разліку 25 «сотак» дапушчальнай максімальнай плошчы, а за мяжой участка пакідалі лазню. Цяпер пры жаданні людзі могуць узаконіць гэты будынак, — звярнула ўвагу суразмоўца.

Сельсавет прымае заяву на легалізацыю і пакет неабходных дакументаў, а пасля накіроўвае даручэнне на разгляд камісіі пры райвыканкаме, дзе ўжо прымаецца станоўчае ці адмоўнае рашэнне. Калі прынята станоўчае рашэнне, сельвыканкам атрымлівае заключэнне і інфармуе грамадзяніна аб тым, што яго справа накіроўваецца далей у праектную арганізацыю. Так што чалавеку ўжо не трэба паўторна хадзіць па інстанцыях, ён проста чакае званка з сельсавета.

— Хтосьці з тых, хто звяртаўся на гэту тэму, прызнаваўся, што разлічваў легалізаваць, як кажуць, «самаволку» абсалютна бясплатна. Мы тлумачым людзям, што закон дазваляе скарыстацца растэрміноўкай аплаты, — распавяла дэпутат. — Але большасць тых, хто ўжо звярнуўся, вырашылі ісці да канца, кажуць, што цягнуць не хочуць. Пакуль ёсць магчымасць зарэгістраваць свае будынкі і зямлю па законе, трэба рабіць.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
Святлана ЯСКЕВІЧ,
Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА (далее – Аукцион) по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в **д. Высокие Ляды, д. Крутая Гора** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

Аукцион состоится **25 апреля 2025 г. в 10.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.

Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	д. Высокие Ляды	624881703601000121	0,1666 га	(1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)	10 000,00
2	д. Крутая Гора	624881708101000044	0,11 га		7 000,00

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by**

УНП 600023532

КАМФОРТ З ДАДАТКОВЫМ СЭНСАМ

Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА расказала, як дэпутаты далучаюцца да Года добраўпарадкавання

Мясцовыя Саветы дэпутатаў ужо актыўна ўключыліся ў рэалізацыю Года добраўпарадкавання. Але, як падкрэсліла Алена Пасюта, работа гэта ніколі не спынялася, таму што пытанні, звязаныя з навядзеннем парадку, стварэннем камфортных умоў для жыцця насельніцтва і грамадзянскімі ініцыятывамі, заўсёды ў топе актуальных.

Рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў дазваляе аб'яднаць людзей дзеля вырашэння праблем і пытанняў, якія ў першую чаргу хвалююць іх саміх. Мінулы год быў плённым, рэалізавалі 15 ініцыятыў на тэрыторыі Гродзенскай вобласці. Яны былі адабраны з 54 прапаноў. На іх рэалізацыю было выдаткавана 300 000 рублёў, з абласнога бюджэту дадаткова выдзелена яшчэ 100 000 рублёў.

— Былі пабудаваны сцэнічныя і спартыўныя пляцоўкі, адрэстаўраваны тры памятна-гістарычных месцы. Таксама была вырашана праблема падтаплення ўчасткаў у гарадскім пасёлку Астрына, афармлена экасцежка, — расказала Алена Пасюта. — І ў цэлым хочацца адзначыць, што людзі актыўна далучаюцца да навядзення парадку на зямлі. Таму заканамерна, што на рэалізацыю праектаў у гэтым годзе выдзелена больш сродкаў — 400 000 рублёў. У абласны Савет на разгляд ужо паступіла 40 грамадзянскіх праектаў. Аналізуем іх, каб вырашыць, якія ідэі вартыя ўдзелу ў конкурсе.

Але ўжо можна вылучыць цікавая праекты, якія маюць усе шанцы прайсці адбор. Шэраг прапаноў прысвечаны 80-годзю Вялікай Перамогі. Напрыклад, ініцыятыва «Памяць у імя будучыні». Аўтары ставяць задачу навесці парадак на тэрыторыі пахавання часоў вайны ў весцы Задвор'е, што ўвекавечвае памяць 260 мірных жыхароў, ахвяр карнай аперацыі.

Мастаўчане прапаноўваюць стварэнне ландшафтнага саду з ленд-арт-аб'ектамі, падзеленага на дзве тэматычныя зоны. Аўтары хочуць стварыць маляўнічае месца, у якім хваёвыя дрэвы як сімвал вечнасці будуць аб'ядноўвацца з яблынямі, сімвалам Перамогі.

— Увогуле, у Мастоўскім раёне вядзецца маштабная работа па навядзенні парадку на памятных месцах. Грамадзяне клапоцяцца, каб памяць аб тых трагічных днях жыла і перадавалася нашчадкам. І гэта задача вельмі ўдала выконваецца ў рамках ініцыятыў «Твой ход», «БТР: БУДЗЕМ ТРЫМАЦЦА РАЗАМ!», а таксама праекта «Памяць» па стварэнні макетаў спаленых вёсак. Усё гэта дазваляе прыцягваць моладзь да даследчай працы, праводзіць экскурсіі і мерапрыемствы, а таксама паглыбляць веды беларусаў пра жахі і гераізм у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У Астравецкім раёне працягваецца рэалізацыя праекта «Мая малая радзіма — 80 гадоў пад мірным небам», які прысвечаны 80-годдзю са дня вызвалення Беларусі. Праект мае на ўвазе стварэнне сквера, дзе будуць размешчаны малыя архітэктурныя формы, памятныя стэнды з інфармацыяй аб ветэранах працы, людзях, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё гаспадаркі. «Сквер Юбілейны», у гонар 80-годдзя Вялікай Перамогі, прапануюць высадзіць у Бераставіцкім раёне.

Цікавы праект — «Любимых уЛИЦ имена». Яго аўтар — беларускі саюз жанчын горада Гродна — прапануе правядзенне даследчай работы па зборы інфармацыі аб жанчынах, у гонар якіх названы вуліцы абласнога цэнтра. Па выніках плануецца выданне зборніка, набору паштовак з фатаграфіямі і інфармацыяй аб жанчынах, а таксама высадка памятнай алеі ў іх гонар.

Алена Пасюта адзначыла, што ўсе падыходзяць да сваіх праектаў творча і намагаюцца не проста зрабіць сваю малую радзіму больш утульнай і прыгожай. Да тэхнічнай часткі амаль заўсёды далучаюцца дадатковыя сэнсы. Напрыклад, у Смаргонскім раёне прапануюць разбіць сквер «Сузор'е сем'яў», дзе ўсе элементы будуць датычыцца дадзенай тэмы.

— «Сквер сям'і, кахання і вернасці» хочуць стварыць у Ваўкавыскім раёне і зрабіць яго прыгожым, размясціць тэматычныя арт-лаўкі: сям'і, сяброўства, закаханых. Маюцца эскізы. Парк павінен стаць пляцоўкай для правядзення мерапрыемстваў, якія будуць звязаны з сям'ёй і сямейнымі каштоўнасцямі: уступленнем у шлюб, святкаваннем вяселляў, гадавін...

Ёсць ідэі, якія датычацца стварэння месцаў адпачынку. У Карэліцкім раёне прапануюць адкрыць скейт-парк і ў цэлым па вобласці — шэраг спартыўных пляцовак з вулічнымі трэнажорамі.

Праблемным пытаннем застаюцца зямельныя ўчасткі і закінутыя будынкі. У рамках выканання Указа № 116 мясцовая сельская ўлада праводзіць актыўную работу па выяўленні такіх дамоў. Вядзецца работа са спадчыннікамі, якія па тых ці іншых прычынах не жадаюць займацца сваёй маёмасцю.

— Перад уладамі на месцах стаіць задача зматываваць людзей не кідаць дамы, даглядаць участкі, патлумачыць, чаму важна не забываць сваю малую радзіму.

Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА разам з удзячнымі жыхарамі і дэпутатамі мясцовых Саветаў каля рэалізаванай ініцыятывы «Спорт для ўсіх» у г. Бярозаўка.

Падводзячы вынікі размовы, Алена Пасюта адзначыла, што ўзровень ініцыятыў і іх падрыхтоўкі значна ўзрос. Быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку навучальныя семінары. У кожным раёне ёсць спецыяльныя фокус-групы, якія дапамагаюць афармляць і пісаць праектныя заяўкі.

Аліса ВОЎК.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

«Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске» (3-я очередь строительства: 1-й пусковой комплекс, 2-й пусковой комплекс, 3-й пусковой комплекс), *опубликованную в газете «Звязда» от 10.08.2023.*

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

в жилом доме № 5 по г. п. (3-я очередь строительства, 2-й пусковой комплекс):

13 (тринадцать) однокомнатных квартир площадью 45–50 кв. м стоимостью 1 кв. метра **от 1700,00 до 1900,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23;

4 (четыре) двухкомнатные квартиры площадью 66-67 кв. м стоимостью 1 кв. метра **от 1550,00 до 1750,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23;

1 (одна) трёхкомнатная квартира площадью 88 кв. м стоимостью 1 кв. метра **от 1480,00 до 1600,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23.

в жилом доме № 6 по г. п. (3-я очередь строительства, 2-й пусковой комплекс):

25 (двадцать пять) однокомнатных квартир площадью 45–49 кв. м стоимостью 1 кв. метра **от 1680,00 до 1900,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23;

5 (пять) двухкомнатных квартир площадью 66-67 кв. м стоимость 1 кв. метра **от 1530,00 до 1750,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23;

1 (одна) трёхкомнатная квартира площадью 89 кв. м стоимостью 1 кв. метра **от 1450,00 до 1600,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23;

1 (одна) пятикомнатная квартира площадью 132 кв. м стоимостью 1 кв. метра **от 1400,00 до 1500,00** долларов США с обязательным условием приобретения не менее одного (1) машино-места в готовом многоуровневом надземном гараж-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23.

Стоимость квадратного метра строящегося объекта долевого строительства формируется застройщиком в зависимости от этажа, площади и условий оплаты.

Условия оплаты квартиры: полная оплата цены договора создания объекта долевого строительства в соответствии с действующими у застройщика условиями по установленному Национальным банком Республики Беларусь курсу белорусского рубля к доллару США на дату зачисления средств на счета застройщика.

Условия оплаты машино-места: полная либо поэтапная оплата цены машино-места по договору купли-продажи в соответствии с действующими у застройщика условиями рассрочки по установленному Национальным банком Республики Беларусь курсу белорусского рубля к доллару США на дату зачисления средств на счета застройщика.

Ознакомиться с планировками квартир и машино-мест можно по предварительной записи в офисе продаж ЖК «Квартал на Грушевке» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 34, пом. 269 по графику пн–пт с 9.00 до 18.00, сб, вс – выходной, тел. +37529 340-52-52 либо на сайте Grushevka.by.

Прием заявлений на заключение договоров создания объекта долевого строительства будет осуществляться в офисе продаж ЖК «Квартал на Грушевке» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 34, пом. 269, с 9.00 дня, следующего за днем опубликования настоящего изменения.

УНП 192975600

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2025.Г.002.00064** о продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

Продавец: Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Солигорскому району, Минская обл., г. Солигорск, ул. Строителей, 24, тел. (8-0174) 23-72-77.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 01.04.2025 в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Автомобиль GEELY SC7,
2014 года выпуска, регистрационный номер 8998 ЕМ-5, тип – легковой автомобиль седан (sedan), кузов (рама) № Y4K8844S5EB001819, цвет – серебряный серый, инвентарный № 01510061.

Местонахождение имущества: Минская область, г. Солигорск, ул. Строителей, 24.
Нач. цена: 1695,34 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 169,53 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 31.03.2025.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Рудинский Андрей Владимирович, тел.: 80174-237168, 8029-2643105.

«ПРОСТЫМІ СЛОВАМІ — ПРА ВАЖНАЕ»

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег КУЗЬМІН — аб асаблівасцях работы з выбаршчыкамі

У АКРУЗЕ

У Івацэвіцкую выбарчую акругу № 11, дзе дэпутатам выбраны Алег Кузьмін, уваходзяць Івацэвіцкі і частка Бярозаўскага раёна. Свае рабочыя паездкі, сустрэчы, прыёмы грамадзян дэпутат Палаты прадстаўнікоў размяркоўвае так, каб за пэўны адрэзак часу пабываць на тэрыторыі ўсіх сельсаветаў кожнага з раёнаў.

ІНФАРМАЦЫЯ З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Алег Аляксеевіч працуе ў Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы. Як педагог з вялікім стажам, асаблівы акцэнт робіць на сустрэчах і стасунках з педагагічнай грамадскасцю, вучнямі і навучэнцамі ўстаноў адукацыі.

Паводле слоў дэпутата, адной з самых эфектыўных форм работы ў акрузе ён лічыць прыёмы грамадзян і прамыя тэлефонныя лініі. «А паколькі акруга ахоплівае 11 гар- і сельсаветаў Івацэвіцкага і 9 — Бярозаўскага раёнаў, то для зручнасці выбаршчыкаў, — кажа ён, — арганізую прыёмы ў кожным з выканкамаў. Людзі прыходзяць з рознымі пытаннямі, праблемамі, прапановамі. Але ж на першым месцы па колькасці — звароты з просьбамі аб паляпшэнні вуліц і дарог. За імі ідзе тэма ўладкавання тратуараў, іншых нюансаў добраўпарадкавання, здараюцца скаргі-прапановы па карэкціроўцы аўтобусных маршрутаў. Звычайна кіраўнікі мясцовай улады бываюць у курсе агучаных праблем. У некаторых выпадках работа па іх вырашэнні ўжо вядзецца: на стадыі праектавання альбо ўключэння ў планы на наступныя гады. Тады застаецца патлумачыць гэта заяўніку, расказаць аб перспектывах. Чалавек, атрымаўшы інфармацыю з першых вуснаў, дзеліцца ёю з суседзямі, аднавяскоўцамі, і больш названае пытанне ўзнімаць не будзе», — кажа Алег Кузьмін.

Даволі частымі сталі звароты, якія датычацца зносу старых аварыйных дрэў. Дэпутат гаворыць, што ўсе яны вырашаюцца ў рабочым парадку профільнымі арганізацыямі. Ужо было некалькі выпадкаў, калі людзі прыходзілі на наступны прыём, каб падзякаваць.

Калі ж гаворка заходзіць аб праблемах газіфікацыі, правядзення камунікацый для электраацяплення альбо водаправода, то даводзіцца тлумачыць грамадзянам пра дарагавізну падобных праектаў і парадак фінансавання. Напрыклад, выйсцем можа стаць утварэнне кааператыва з часткавым фінансаваннем — грамадзян і бюджэту. Такія пытанні ўзніміліся ў Яглевіцкім, Квасевіцкім сельсаветах. Варта сказаць, што нашы вясковыя жыхары цяпер дастаткова інфармаваныя, хочуць жыць з камфортам і гарадскімі выгодамі, і гэта цалкам зразумела. Трэба толькі даступна, з лічбамі і фактамі расказваць людзям аб рэальных перспектывах, тлумачыць на прыкладах, тады, як правіла, сустракаеш разуменне, лічыць дэпутат.

«У асобных выпадках разам з памочнікамі мы рыхтуем адпаведныя пісьмы-запыты ў адрас раённай выканаўчай улады. Хачу сказаць, што на іх атрымліваем аператыўнае рэагаванне і паведамляем заяўніку. Падобныя стасункі з людзьмі каштоўныя яшчэ і тым, што асобныя праблемы бяруцца на кантроль, занатоўваюцца як матэрыял для магчымага ўдасканалення заканадаўства».

АБ ТЫМ, ШТО ХВАЛЮЕ

Адной з дзейсных форм атрымання зваротнай сувязі парламентарый назваў сустрэчы ў працоўных калектывах. За год работы Алег Кузьмін пабываў у 116 такіх калектывах. «Кожная такая сустрэча прыносіць не толькі новыя знаёмствы. На падобных мерапрыемствах даволі часта сустракаю сваіх былых вучняў, іх бацькоў, сваіх землякоў, аднакласнікаў. І гэта не толькі дае падтрымку, але і накладвае дадатковую адказнасць. Выбаршчыкі чакаюць ад мяне адказаў на канкрэтныя пытанні, размоў аб тым, што іх хвалюе. На сустрэчах у калектывах мы звычайна абмяркоўваем надзённыя пытанні палітычнага і грамадскага жыцця нашай краіны. Сутнасць узнятых тэм стараюся раскрыць простымі словамі. І вельмі радуюся, калі атрымліваю водгук, калі адчуваю падтрымку аўдыторыі».

Паводле слоў дэпутата, нярэдка ў працоўных калектывах узнімаюцца канкрэтныя праблемы, звязаныя з умовамі працы, захаваннем экалагічных норм, наяўнасцю інфраструктуры, кадраў. Парламентарый стараецца аператыўна рэагаваць на запыты з тым, каб праблемы вырашаліся. Так было, напрыклад, у РМУ (рамонтна-маставым упраўленні) РУП «Брэстаўтадар». Мінулай восенню падчас прыёму грамадзян яго кіраўнік узняў праблему забеспячэння спецыялістамі рабочых прафесій. Дэпутат накіраваў запыт у Міністэрства адукацыі, менавіта там падказалі шляхі вырашэння праблемы. І падчас сустрэчы ў гэтым працоўным калектыве сёлета прагучала падзяка за дапамогу.

НА ЎРОК — ДА ДЭПУТАТА

У Алега Кузьміна ёсць і свой праект, які ён рэалізуе ў акрузе. Праект называецца «Школьніку пра важнае. Урокі дэпутата». Як ужо гаварылася, Алег Аляксеевіч у мінулым настаўнік і кожны тыдзень, адведзены для работы ў акрузе, наведвае школу, каледж, іншую навучальную ўстанову. «Падчас сустрэчы з вучнямі мы шмат гаворым пра любоў да Радзімы, разбіраем з імі, што такое патрыятызм і яго складнікі, гаворым пра дружбу, любоў, веру і вернасць. І ведаеце, нярэдка дзеці радуюць сваімі недзіцячымі меркаваннямі на ўзнятыя тэмы. Так было ў школе № 3 Івацэвічаў, у Агародніцкай школе Бярозаўскага раёна, шэрагу іншых, дзе старэйшыя школьнікі прадэманстравалі актыўную грамадзянскую пазіцыю, высокі інтэлектуальны ўзровень».

«Яны, дарэчы, уважліва слухаюць расповеды аб асаблівасцях работы парламентарыя, задаюць нямала пытанняў аб тым, як рыхтуюцца і прымаюцца законы, як наладжаны кантроль за іх выкананнем, — працягвае Алег Кузьмін. — У кожнай навучальнай установе сустрэчы маюць свае асаблівасці. Але нярэдка выкарыстоўваю іх як магчымасць прафарыентацыйнай работы, расказваю юнакам і дзяўчатам аб прафесіі настаўніка, якую і сёння лічу самай лепшай прафесіяй на зямлі. У адказ нярэдка чую даволі канкрэтныя пытанні пра асаблівасці атрымання профільнай адукацыі і далейшай работы, што таксама радуе».

«Наогул люблю камунікаваць з моладдзю, — гаворыць дэпутат. — Яны найбольш актыўныя падпісчыкі і сузмоўцы ў сацыяльных сетках, якія я актыўна выкарыстоўваю з першага дня работы ў парламенце. Прысутнічаю ў «Фэйсбуку», у «Інстаграме», у «Тэлеграме». Дарэчы, нямала падпісчыкаў — мае былыя вучні. Яны нярэдка задаюць канструктыўныя пытанні, уключаюцца ў абмеркаванне той ці іншай тэмы, выказваюць прапановы».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва дэпутата.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Организатор электронного аукциона	ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by
Продавец	ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102

Девятые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 19.02.2025 в газете «Звязда» № 34 (30422), стр. 12

Предмет электронного аукциона

№	Наименование (назначение), адрес	Начальная цена	Минимальная цена
1	Дебиторская задолженность. Наименование дебитора: акционерное общество «Торговый дом «Оргсинтез» (125319, Россия, г. Москва, Муниципальный округ аэропорт вн. тер. г., ул. Академика Ильюшина, д. 12, эт/пом/ком/оф 1/VII/АЗД, огрн: 1127747058284, дата присвоения ОГРН: 18.10.2012, ИНН: 7714887246, КПП: 771401001)	По цене исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 9 153,41 росс. руб. без НДС по курсу НБ РБ на день проведения торгов	По цене исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 4 119,03 росс. руб. без НДС по курсу НБ РБ на день проведения торгов

Шестые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. ***Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 19.02.2025 в газете «Звязда» № 34 (30422), стр. 12***

2	Электрокран-балка 3,2 т, бывший в эксплуатации	1 224,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %	530,40 бел. руб. с учетом НДС 20 %

Четвертые повторные публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. ***Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 19.02.2025 в газете «Звязда» № 34 (30422), стр. 12***

3	Подъемник с электролебедкой К-1, инв. 9595, бывший в эксплуатации	2 160,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %	360,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %
4	Люлька строительная ЛЭ-150-120, инв. № 9584, бывшая в эксплуатации	2 520,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %	420,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %

Вторые публичные торги в форме электронного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. ***Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 19.02.2025 в газете «Звязда» № 34 (30422), стр. 12***

5	Участок производства резиновых нитей из латекса, корпус № 68А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/22	618 720,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %	309 360,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг электронного аукциона – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников электронного аукциона начальная цена электронного аукциона поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками электронного аукциона

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах электронного аукциона

Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения электронного аукциона. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **1–4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

Дата и время проведения электронного аукциона:
04.04.2025,
начало электронного аукциона: 10.00,
окончание электронного аукциона: 16.00,
электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 20.03.2025 по 03.04.2025 г. до 16.00

Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	Унитарное предприятие «БелшинаТранс», Могилевская область, г. Бобруйск, Минское шоссе. УНП 790913853
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов
Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Минское шоссе (территория ОАО «Белшина»)

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Грузовой седельный тягач MAZ-5440 18**, АА 8358-6, 2008 г. в.	**26 244,00**
2	**Грузовой седельный тягач MAZ-5440 19**, АА 8359-6, 2008 г. в.	**26 244,00**
3	**Грузовой седельный тягач MAZ-MAN 543268**, АІ 4390-6, 2005 г. в.	**13 122,00**
4	**Экскаватор S-1203**, завод. № 54272, 1990 г. в.	**26 244,00**
5	**Погрузчик фронтальный (категория «F»)**, ТО-18Б, МБ 6317, 1993 г. в.	**26 244,00**
6	**Грузовой седельный тягач MAZ-544069 320-031**, АІ 7879-6, 2008 г. в.	**38 948,00**
7	**Машина универсальная «Беларус МУ-466»**, ІВ-6 2049, 2012 г. в.	**177 361,96**

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: в течение **30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by
Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, размещенном на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 15.02.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 31.03.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: ww.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 29 154 34 35
Продавец	УП «НАЦИОНАЛЬНЫЕ СПОРТИВНЫЕ ЛОТЕРЕИ», г. Минск, пр-т Независимости, 49, пом. 25, тел. +375 29 607 75 72
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. Тел. +375 44 704 92 06, www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на 3 года

№ лота	Наименование недвижимого имущества	Размер арендной платы за месяц	Начальная цена/сумма задатка	Шаг торгов
1	**Административное помещение (административное помещение)** с инвентарным № 200/D-114180, общ. пл. 34,3 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, 31А, пом. 1	**548,25 бел. руб.**	**152,29 бел. руб.**	**7,61 бел. руб.**

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 21.04.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **18.04.2025 до 17.00**

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (au.nca.by) 19.03.2025 г.

Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by

ПАД ДАХАМ ДОМА СВАЙГО...

Унучка набыла бабуліну хату праз аўкцыён

...Добра паехаць у вёску да бабулі, калі на вуліцы цёпла і сонечна. А калі бабулі ўжо няма?.. Памяць пра яе заслалася, але бывае сумна, нават балюча ехаць туды, дзе цябе ніхто не чакае, не сустрэне. Пустуюць старыя хаты — збыць іх людзі не рашаюцца, а даглядаць няпроста, бо жывуць далёка. У такіх выпадках за справу бярэцца мясцовая ўлада. Здараецца, што пытанне паўстае рубам: быць ці не быць такому будынку на гэтай зямлі? Як ні дзіўна, канкрэтныя рашэнні могуць абудзіць інтарэс нашчадкаў да сваёй спадчыны. Так адбылося ў Бярозаўскім раёне на Брэстчыне...

ВЯРНУЦЬ УТУЛЬНАСЦЬ

У вёску Галавіцкія Таццяна Пунько ездзіла з дзяцінства да бабулі, бывала, што праводзіла тут канікулы. Але рана памерла мама, і сувязь з яе радзімай у жанчыны ўжо не была такой блізкай. Тым больш што пасля смерці бабулі яе хатай павінна была апекавацца другая дачка і сын. Родны дзядзечка Таццяны жыў непадалёк і спачатку прыглядаў за будынкам, але неўзабаве пакінуў свет. Нейкі час хату і тэрыторыю каля яе не было каму даглядаць. А пасля высветлілася, што ні на каго нават не былі афармлены дакументы...

— Я не губляла цікавасці да гэтага дома са смерці бабулі, — кажа Таццяна Пунько. — Але былі іншыя сваякі, якія знаходзіліся бліжэй, чым мы. Калі паўстала пытанне, што рабіць з будынкам і ўчасткам, на якім ён стаіць, магчыма, усе так і разважалі: навошта ўнучцы, што жыве ў Мінску, хата ў Брэсцкай вобласці?.. Але мне вельмі дарагі гэты дом успамінамі, цеплынёй, якая захоўваецца ў сэрцы нават пасля смерці дарагіх людзей. Таму калі мы з мужам даведаліся пра продаж бабулінай хаты, нядоўга думалі. Усё ў нас атрымалася дзякуючы старшыні сельсавета Івану Паўлавічу — ён запрасіў на аўкцыён, трымаў у курсе на кожным этапе, сачыў і інфармаваў, як рыхтуюцца дакументы. Былі і іншыя сваякі, больш далёкія, якія цікавіліся домам і хацелі б яго набыць. Але яны адступілі, калі даведаліся пра маё жаданне: я ж родная ўнучка. З задавальненнем ездзім туды і намагаемся вярнуць хаце ўтульнасць, ужо правялі святло і ваду. Але гэта ўсё прыемныя клопаты. Важна, што дом застаўся ў нашай сям'і.

ПОШУК НАШЧАДКАЎ

— У нас створана камісія па выяўленні хат, якія пустуюць, — распавядае **старшыня Стрыгінскага сельскага Савета Іван КРАГЕЛЬ.** — Гэта хата ў вёсцы Галавіцкія трапіла ў поле зроку. Мы яе абследавалі, склалі акт. Але, перш чым прымаць нейкія рашэнні наконт далейшага лёсу пабудовы, звычайна шукаем нашчадкаў. Спачатку выйшлі на дачку былой гаспадыні: ці будзе яна займацца домам? Яна адмовілася, і мы афармілі хату ва ўласнасць сельскага Савета. Далей прымалася рашэнне: альбо пусціць пад знос, альбо выставіць на продаж. Згодна з парадкам, вызначылі ацэначны кошт (у памеры 300 рублёў у 2023 годзе), а пасля была размешчана аб'ява аб продажы праз аўкцыён... Калі справа ўжо закруцілася, абсалютна нечакана мы пачалі кантактаваць з унучкай былой гаспадыні: яе ўзрадавала тое, што будынак не пойдзе пад знос, і зацікавіла магчымасць яго выкупіць. Вельмі перажывала, каб ніхто ў апошні момант не перахапіў. Атрымалася так, што першы аўкцыён, на якім была выстаўлена гэта хата, не адбыўся, як і другі, а на трэцім яна была адзіным пакупніком, што прэтэндаваў на гэты дом. Яны задаволены, што змаглі вярнуць сабе хату бабулі. І мы задаволены: жанчына напісала заяву на афармленне, бачым, што дом і ўчастак каля яго даглядаюць.

А быў яшчэ выпадак у гэтым сельсавеце. Вялі пошук нашчадкаў адной з хат. Пасля смерці гаспадара яе атрымала ў спадчыну ўдава, з якой ён узяў шлюб ужо ў пажылым узросце. Пасля яе права на хату перайшло да дачкі, якая жыве ў Брэсце. Ад маці ёй засталася кватэра, але пра дом яна нават не ведала, была вельмі здзіўлена, калі патэлефанавалі з Бярозаўскага раёна. Адразу сказала, што займацца хатай не будзе, каб выстаўлялі на продаж...

РЭАЛЬНАЯ КАРЫСЦЬ

Як правіла, нашчадкаў закінутых хат знаходзіць удаецца, няхай гэта і сваякі не першай лініі, не ў першым пакаленні. У Стрыгінскім сельсавеце быў толькі адзін выпадак, калі патэнцыяльных гаспадароў дома выявіць не ўдалося. На сённяшні дзень у сельсавеце вырашаецца лёс чатырох закінутых хат. Звычайна пад знос ідуць адзінкі, і добра, што дзякуючы Указу № 116 ёсць магчымасць іх прадаваць, лічыць старшыня сельсавета Іван Крагель.

За год сельсавет выстаўляе на аўкцыён каля дзесяці такіх лотаў, у асноўным за адну базавую велічыню. Але бывае так, што падчас продажу цана значна ўзрастае. Так здарылася на аўкцыёне, які адбыўся 12 снежня 2024 года: на адзін дом, выстаўлены сельсаветам, прэтэндавалі тры чалавекі, два з іх змагаліся сур'ёзна, а канчатковая цана дасягнула ў эквіваленце 5200 долараў ЗША. Значыць, ёсць сэнс добраўпарадкаваць тэрыторыю, што падкрэслена рэальнай карысцю — грашовай.

— Гэта добра для бюджэту сельскага савета, — адзначае старшыня сельсавета. — У прыватнасці, будзем звяртацца ў райвыканкам з просьбай аб тым, каб належным чынам уладкаваць дзіцячую пляцоўку ў аграгарадку Стрыгінь. Атрыманыя праз аўкцыён сродкі пускаем на мясцовыя патрэбы, каб больш зрабіць для людзей.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11 291. Нумар падпісаны ў 19.30 18 сакавіка 2025 года.

ЭКАЛАГІЧНЫ КАНТРОЛЬ

Смецце каля гаражоў: хто вінаваты і што рабіць?

Нагадаць землякам, што чыста не там, дзе прыбіраюць, а дзе не смецяць, вырашыў неабыякавы гамяльчанін, фотакарэспандэнт Андрэй Феакцістаў і даслаў у СМІ здымкі... смецця на ўскраіне Гомеля. Аказалася, што гэта забруджаная тэрыторыя трапіла не толькі ў аб'ектыў фатографа, але яшчэ раней — у «чорны спіс» гомельскіх эколагаў. Не адкладаючы вырашэнне праблемы, менавіта з гэтага пункта стартаваў першы ў горадзе працоўны дэсант вясновага месячніка па добраўпарадкаванні. Каб рэальна параўнаць, як было і як стала, у рэйд з камунальнымі службамі на прыборку выехала і карэспандэнт «Звязды».

Гэта нешырокая грунтавая дарога каля гаражнага кааператыва і лесапаласы ўздоўж чыгункі і раней патрабавала ўвагі супрацоўнікаў Гомельскай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Як правіла, аддаленыя нешматлюдныя тэрыторыі прыцягваюць аматараў па-хуткаму пазбавіцца ад буйнагабарытнага бытавога смецця. На адзначанай тэрыторыі на ўскраіне Цэнтральнага раёна Гомеля сітуацыя іншая: на абочынах дарогі сабралася менавіта кінутае смецце. Вось рэальны прыклад, падкрэсліваюць эколагі, што адбываецца, калі кожны неўзаметку мімаходам выкідвае кубак з-пад кавы, пакет, бутэльку...

У канцы восені камунальныя службы раёна ўжо наводзілі тут парадак. Маніторынг у зімовы перыяд правялі супрацоўнікі інспекцыі.

Атрымліваецца, бруд, што ўтварыўся, — вынік «дзіравых кішэняў» ці проста безадказнага стаўлення мінакоў толькі за апошнія месяцы.

— Дарога вядзе да найбліжэйшага пасёлка Плёсы, на раку. Побач і чыгуначная станцыя. Адпачывальнікі, дачнікі, якія карыстаюцца гэтай дарогай, мімаходам кідаюць смецце, — патлумачыў сітуацыю **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Цэнтральнага раёна Гомеля Кірыл ЮДЗІН.** — З пачаткам веснавога месячніка па добраўпарадкаванні было прынята рашэнне пачаць прыборку ў горадзе з дадзенай тэрыторыі. Ініцыятыву ў навядзенні парадку падтрымалі члены гаражна-будаўнічага спажывецкага кааператыва № 16 Цэнтральнага раёна Гомеля. Задзейнічана і служба камунальнага аўтамабільнага ўнітарнага прадпрыемства па ўтрыманні дарог «ГарСАП», якая садзейнічае прыбіранню і вывазу смецця, — дадаў суразмоўца.

Вельмі непрыемная карціна тут назіралася і ў баку ад грунтоўкі — насупраць уезду ў гаражны кааператыў. Менавіта мясцовыя вартаўнікі адгукнуліся на просьбу ўлад дапамагчы прыбраць прылеглую тэрыторыю агульнага карыстання — участак паблізу разваротнага кальца грамадскага транспарту. Па словах вартаўнікоў гаражнага кааператыва, тут смецце — справа рук вадзіцеляў маршрутных таксі, якія аблюбавалі для стаянкі тэрыторыю каля гаражоў. Сапраўды, такія факты не раз пацвярджаліся, зазначаюць і ў аддзеле ЖКГ раёна.

— Тут пытанне можа вырашыць знак «Стаянка забаронена», таму што маршрутчыкі пад'язджаюць, дзверы адчыняюць, «выцярушваюць» усё смецце з машын, перакусваюць, а потым у лясок па натуральнай патрэбе, — не хаваючы праўды жыцця, абураецца **часова выконваючы абавязкі старшыні гаражна-будаўнічага спажывецкага кааператыва № 16 Цэнтральнага раёна Гомеля Ілья МАЛЫШЧЫК.**

У пацвярджэнне яго слоў тэрыторыю маляўніча пакрываюць рэшткі пластыкавага посуду, бутэлькі, а за гаражамі — шматлікія сляды ад натуральных патрэб.

— Побач канцавы прыпынак грамадскага транспарту, разваротнае кальцо. Ёсць кантэйнеры для смецця, прыбіральня. Дык не, пад'язджаюць, смецяць тут. Падыходжу, раблю заўвагу, адказваюць: «Знака няма, маем права». Мы вельмі просім улады горада вырашыць пытанне са знакам, — ад сябе асабіста і ўсіх карыстальнікаў гаражнага кааператыва звяртаецца Ілья Малышчык.

Магчыма, вырашыць праблему на гэтай тэрыторыі дапаможа і ўзмацненне кантролю. Як звярнула ўвагу **намеснік начальніка Гомельскай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аліна ПЛОТНІКАВА**, для кантролю сітуацыі і ўстанаўлення нядобрасумленных грамадзян, што смецяць на падобных тэрыторыях, прымяняюцца фотапасткі.

— Як правіла, у ліку праблемных месцаў, дзе мы ўвесь час праводзім агляды, — пусткі, тэрыторыі, якія не ахоплены гаспадарчай дзейнасцю. Нагадаем, што за парушэнне заканадаўства аб абыходжанні з адходамі прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — штраф да 30 базавых велічынь, а ў дачыненні да юрыдычнай асобы — да тысячы базавых. Таксама разлічваецца шкода, прычыненая навакольнаму асяроддзю ў выніку яе засмечвання адходамі, — падкрэсліла эколаг.

Дарэчы, за час сумеснага рэйду па навядзенні парадку каля ўезду ў гаражы і ўздоўж лесапаласы было сабрана каля пяці тон смецця. Каб прыбраць тое, што пакінулі нядобрасумленныя грамадзяне, прыйшлося «адпрацаваць» тэрыторыю больш чым у два кіламетры. Між тым, пакуль рыхтаваўся матэрыял, гамяльчане перадалі шчырую падзяку камунальным службам горада і эколагам.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «Агат-электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317

Предмет электронных торгов: оборудование (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)

Лот, №	Инв. номер	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	42320014	Вибромашина ВМ100	**400,00**
2	43551737	Многокомпонентный электрохимический газоанализатор «Каскад-Н 41.2»	**1000,00**
3	43372913	Частотомер электронно-счетный ЧЗ-34	**554,15**
4	43372916	Частотомер электронно-счетный ЧЗ-34	**554,15**
5	43374617	Частотомер электронно-счетный ЧЗ-54	**2386,99**
6	43375464	Частотомер электронно-счетный ЧЗ-54	**2386,99**
7	43374833	Измеритель комплексных коэффициентов передачи Р4-11	**2990,18**
8	43375068	Генератор Г5-56	**1365,10**
9	43375674	Генератор Г5-56	**1365,10**
10	43376316	Генератор Г3-123	**678,50**
11	43376407	Генератор Г3-123	**678,50**
12	43374262	Осциллограф С1-67	**328,86**
13	43374368	Осциллограф С1-67	**328,86**
14	43374372	Осциллограф С1-67	**328,86**
15	43374421	Осциллограф С1-68	**194,76**
16	43374172	Осциллограф С1-68	**194,76**
17	43374232	Осциллограф С1-68	**194,76**
18	43374857	Осциллограф С1-55	**223,00**
19	43375000	Осциллограф С1-55	**223,00**
20	43375145	Осциллограф С1-55	**223,00**
21	43375221	Осциллограф С1-55	**223,00**
22	43375224	Осциллограф С1-55	**223,00**
23	42201065	Электроталь Т-10232	**408,00**
24	42201099	Кран-балка с электроталью Т-10332	**1896,00**
25	70002360	Верстаки 265015002	**150,00**
26	60002016	Плита поверочная	**1718,40**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2025 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **03.04.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.04.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества, принадлежащего
УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений
на праве хозяйственного ведения (Продавец).

Аукцион состоится 10.04.2025 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:
Часть площадью 10,0 кв. м платформы пассажирской высокой с инв. № 500/С-1014077.
Срок договора аренды – с 01.05.2025 по 30.09.2025.
Адрес: г. Минск, ст. «Заслонова».
Начальная цена с НДС 20 % – 44,40 руб.

Лот № 2:
Часть площадью 2,0 кв. м капитального строения с инв. № 600/С-132904.
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ст. Ждановичи, 1, здание железнодорожного вокзала
Срок договора аренды – 5 лет.
Начальная цена с НДС 20 % – 8,88 руб.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by
УНП 190055182

СКАРБЫ ПАД НАГАМІ

СЫРАВІНЫ ХОПІЦЬ НА 100 ГАДОЎ

А разведаных запасаў у нас сапраўды шмат. З 9 тысяч тарфяных радовішчаў краіны арганізацыямі тарфяной прамысловасці Мінэнерга распрацоўваецца толькі 37. Сёння адведзена 9,5 тысячы гектараў плошчаў для здабычы торфу з запасамі паліва ў 33,2 мільёна тон. Спецыялісты ведамства цяпер распрацоўваюць каля 11 % ад усяго аб'ёму прамысловых запасаў, або 1,3 % ад агульнага аб'ёму запасаў тарфяной сыравіны.

Пры дасягненні ўстаноўленых праграмай комплекснай мадэрнізацыі тарфяных вытворчасцяў на 2021–2025 гады аб'ёмаў здабычы запасаў торфу ў краіне дастаткова для распрацоўкі і выкарыстання яго ў эканоміцы на найбліжэйшыя 100 гадоў.

Штогод у Беларусі здабываецца каля 2 мільёнаў тон торфу. З яго вырабляецца 1,2 мільёна тон тарфяной прадукцыі, у тым ліку каля мільёна тон – паліўнай групы, што дазваляе штогод замяшчаць больш за 450 мільёнаў кубічных метраў імпартнага прыроднага газу. Вырабляецца звыш 100 тысяч тон прадукцыі непаліўнага прызначэння (грунты пажыўныя, торф верхавы кіпаваны).

Летась арганізацыі тарфяной прамысловасці здабылі 1,9 мільёна тон торфу, што дазваляе цалкам забяспечыць унутраныя патрэбы краіны. Пры гэтым доля нашай дзяржавы ў агульным аб'ёме сусветнай торфаздабычы складае каля 15 %, а ў аб'ёме вытворчасці тарфяной паліўнай прадукцыі – каля 35 %.

Прадукцыя торфабрыкетных заводаў пастаўляецца арганізацыям ЖКГ, цэментнай прамысловасці, насельніцтву, яна запатрабавана ў сельскай гаспадарцы, а таксама экспартуецца на знешнія рынкі.

Асноўнымі спажыўцамі тарфяной паліўнай прадукцыі з'яўляюцца цэментавыя заводы і паліваазабяспечвальныя арганізацыі. У структуры рэалізацыі яны займаюць 51,9 % і 27 % адпаведна.

ПАЖЫЎНЫЯ ГРУНТЫ І НАТУРАЛЬНАЯ ПАДКОРМКА

Як адзначыў Сяргей Дзмітрыеў, асаблівая ўвага ўдзяляецца непаліўнай групе ў сегменце паставак прафесійных пажыўных грунтоў на ўнутраны рынак і экспарт. А апошнім часам сталі распрацоўваць такую тарфяную прадукцыю, што адпавядае характарыстыкам, якія неабходныя вытворцам грыбоў.

У гэтым кірунку арганізацыямі аб'яднання пастаянна вядзецца работа па пашырэнні асартыментнага пераліку такіх грунтоў. Сумесна з НАН Беларусі распрацавана больш за 50 рэцэптур тарфяных субстратаў, якія могуць быць спакаваныя ў розную тару ад пяці да 250 літраў і выкарыстаны як для патрэб хобі-рынку, так і ў прамысловых цяплічных камбінатах.

Праводзіцца работа па пашырэнні наменклатуры выпуску прадукцыі на аснове торфу з высокай дабаўленай вартасцю, створана рабочая група з Інстытутам прыродакарыстання НАН Беларусі.

«ЯДОМЫЯ» ГЕЛІ І ЛАСУНКІ ДЛЯ ГРЫБОЎ

Па гэтых кірунках спецыялісты ўжо выйшлі на практычнае прымяненне. Напрыклад, летась арганізавана вытворчасць вадкіх і сухіх гуматаў на аснове торфу. Выпушчана доследная партыя і апрабавана ў якасці стымулятара росту раслін на сельгаспрадпрыемствах аб'яднання. У 2025 годзе тэхналогіі вытворчасці гуматаў будуць удасканальвацца ў бок павышэння якасці, а таксама атрымання новых відаў экспартна арыентаванай прадукцыі (сухія гуматы, гуматы ў выглядзе гелю).

Значным імпартазамяшчальным праектам стала адкрыццё ў 2022 годзе цэха па вытворчасці покрыўных грунтоў для вырошчвання шампіньёнаў. Вытворчая магутнасць цэха – 40 тысяч тон грунтоў у год. Аб'ёмы рэалізацыі асноўным вытворцам грыбоў у нашай краіне (13 арганізацый) выраслі за два гады з 18 да 24 тысяч тон (у 1,3 раза), прагноз рэалізацыі ў 2025 годзе складзе 25 тысяч тон.

Летась распачата рэалізацыя праекта па будаўніцтве цэха па кіпаванні торфу і вытворчасці тарфяных субстратаў праектнай магутнасцю 32,5 тысячы тон у год, у рамках якога будзе рэалізаваны выпуск шырокага спектра пажыўных грунтоў. Арганізацыямі аб'яднання вядзецца работа па нарошчванні экспартных рынкаў збыту.

ЗАЦІКАВІЛІ КІТАЙ, В'ЕТНАМ І ТУРЦЫЮ

Усяго за мінулы год на знешнія рынкі было пастаўлена 121,4 тысячы тон тарфяной прадукцыі паліўнага і непаліўнага прызначэння. У вартасным выражэнні наша краіна выручыла амаль 10 мільёнаў долараў.

Сяргей Дзмітрыеў адзначыў, што для захавання і павелічэння аб'ёмаў экспартных паставак «Белпалівагазам» прымаюцца меры па дыверсіфікацыі экспарту. Сёння гэта арганізацыя актыўна займаецца выхадам на рынак Кітая, павялічвае пастаўкі расійскім спажыўцам, прапрацоўваюцца сувязі з новымі кліентамі (В'етнам, Узбекістан, Турцыя). Па стане на сярэдзіну сакавіка акрэдытацыю на пастаўкі ў Кітай маюць тры торфазаводы нашай краіны («Глінка», «Віцебскторф», «Туршоўка»).

Вядзецца работа па выхадзе на новыя знешнія рынкі краін Цэнтральнай Азіі, Блізкага і Далёкага Усходу шляхам удзелу ў міжнародных спецыялізаваных выставах. У ходзе выставачных мерапрыемстваў арганізацыямі тарфяной галіны ДВА «Белпалівагаз» прадстаўляецца экспазіцыя з узорамі прафесійных тарфяных субстратаў беларускай вытворчасці, іх складнікаў і спосабаў прымянення.

Па выніках удзелу ў выстаўках па заключаных кантрактах было пастаўлена тарфяной прадукцыі на суму больш чым 400 тысяч долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: Государственное предприятие **«Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»**, *220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685.*

Торги проводятся **17.04.2025 г.** ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

Право заключения договора аренды на изолированное помещение (инв. № 500/D-70788364),

расположенное по адресу: г. Минск, ул. Алеся Гаруна, д. 28, пом. 1Н.

Окончание приема заявлений – **14.04.2025 до 15.00.**

Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**

УНП 130505364

Утерянные представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланки строгой отчетности «Добровольное страхование наземных транспортных средств», серии ТСН № 0325277–0325300, в количестве 24 экземпляров **считать недействительными.**

УНП 100122726

Информация о проведении открытого аукциона 24 апреля 2025 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	**г. Смолевичи, ул. Евфросиньи Полоцкой, 18**	624850100008000008	0,1363	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	30 000
2	**г. Смолевичи, ул. Владимира Купревича, 44**	624850100008000883	0,15	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	31 000

Аукцион состоится **24 апреля 2025 г. в 15.00** в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125,* зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР

ВЫРАТАВАЦЬ СІТУАЦЫЮ

Зламаны зуб можна аднавіць

Зламаць зуб — страшны сон кожнага чалавека, бо часта такая праблема асацыюецца з поўнай яго стратай. Нярэдка ў такую сітуацыю трапляюць дзеці: яны актыўна займаюцца спортам, асвойваюць язду на веласіпедзе ці каньках, што немагчыма без падзенняў. На справе далёка не заўсёды зламаць зуб — значыць застацца без яго. Усё залежыць ад ступені пашкоджання, паводзін бацькоў і самога маленькага пацыента. Аб варыянтах выратавання зламанага зуба расказала дзіцячы ўрач-стаматолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Наталля ЖУРАЎЛЁВА.

— Якія бываюць траўмы зуба?

— Іх можна падзяліць на дзве групы: адлом часткі зуба і пашкоджанні звязкавага апарата, гэта значыць тых валокнаў, якімі зуб мацуецца да сківічнай косткі.

Для маленькіх дзяцей асноўнай прычынай траўмы зубоў з'яўляецца падзенне, для малодшых школьнікаў з «юнымі» пастаяннымі зубамі — заняткі спортам. Таму трэба бяспечна абсталёўваць месцы баўлення часу дзяцей, а падчас заняткаў небяспечнымі відамі спорту выкарыстоўваць спецыяльныя ахоўныя прыстасаванні — капы.

— Што рабіць, калі зубы ўсё ж былі пашкоджаныя?

— Найперш захоўваць спакой. Вам спатрэбіцца ўвесь ваш рэсурс, каб супакоіць дзіця і выбраць тую тактыку паводзін, якая дапаможа звесці наступствы траўмы да мінімуму. Ацаніце агульны стан дзіцяці: ці была страта прытомнасці або галавакружэнне. Зубы знаходзяцца ў сківічнай косткі, якая з'яўляецца часткай чэрапа. Звесткі аб стане дзіцяці ў момант траўмы дапамогуць урачу высветліць, ці была чэрапна-мазгавая траўма.

Пасля акуратна абследуйце месца траўмы зуба, каб паспрабаваць вызначыць, што з ім адбылося. Калі адсутнічае частка зуба, трэба паспрабаваць знайсці абломак. Досыць часта яго яшчэ можна «прыляпіць». Знойдзены абломак варта змясціць у слоічак з вадой і разам з пацярпелым дзіцем звярнуцца да стаматолага як мага хутчэй.

Каб выключыць схаваныя пашкоджанні, напрыклад пералом кораня, доктар зробіць рэнтгенаўскі здымак і акажа неабходную дапамогу, прыляпіўшы абломак або вырабіўшы пломбу. Пакідаць скол незакрытым нельга — можа адбыцца інфіцыраванне і ў далейшым гібель нерва.

Калі зуб выглядае цэлым, але ён зрушаны ці рухомы, пра што дзеці часта кажуць самі, хутчэй за ўсё разарвалася частка валокнаў, якія мацуюць яго да сківіцы. Такі стан называюць падвывіхам (пры нязменным становішчы зуба) або няпоўным вывіхам (калі зуб змяніў сваё становішча). Дзіця павінна быць дастаўлена да ўрача максімальна хутка. Паколькі падвывіх або няпоўны вывіх не выключае рызыку схаванага пералому, неабходна будзе таксама зрабіць рэнтгенаўскі здымак.

Пасля гэтага стаматолаг правядзе шыніраванне ці, прасцей кажучы, «падвязванне» пашкоджанага зуба да непашкоджаных суседніх, каб зменшыць нагрузку на яго пры прыёме ежы. Шына звычайна накладваецца на 3-4 тыдні, што дастаткова для аднаўлення пашкоджаных валокнаў. У гэты перыяд вельмі важна выконваць усе правілы догляду за зубамі — яны павінны быць проста ідэальна чыстымі, каб мікраарганізмы зубнога налёту не пашкодзілі працэсу гаення.

— А калі зуб выбіты цалкам?

— Гэта самая цяжкая сітуацыя, і называецца яна поўны вывіх. Калі дзіця ў выніку траўмы губляе пастаянны зуб, сківіца, якая яшчэ расце, у гэтым пустым участку перастае развівацца. Ужо наяўныя зубы пачынаюць паступова ссоўвацца, фарміруецца паталогія прыкусу.

Аптымальнае рашэнне ў гэтай сітуацыі — знайсці выбіты зуб. Яго варта ўзяць за каронку, не датыкаючыся да кораня, асцярожна прамыць пад вадой. З паверхні кораня ні ў якім разе нічога нельга аддзіраць — там будуць зрыўкі мацуючых валокнаў. Затым неабходна акуратна ўставіць зуб, наколькі атрымаецца, на яго месца ў ямку ў косці (лунку). Пасля гэтага трэба неадкладна звярнуцца да стаматолага. Урач праверыць, ці правільна ўстаўлены зуб, калі патрабуецца, паправіць яго становішча і правядзе шыніраванне. Далейшая тактыка практычна тая ж, што і пры няпоўным вывіху.

Калі ўставіць зуб у лунку па якіх-небудзь прычынах немагчыма, яго трэба змясціць у халоднае малако (звычайная вада не падыходзіць) або за шчаку (калі ўпэўненыя, што дзіця яго не праглыне) — і адразу ж да стаматолага. Тут крытычная кожная хвіліна. Позна ўстаўлены зуб прыжываецца няправільна, паступова замяшчаючыся косткай.

На жаль, прадказаць зыход траўмы ў момант яе атрымання немагчыма — мы не можам сказаць дакладна, якія тканкі і наколькі пашкоджаны і які ў іх патэнцыял да аднаўлення. Вось чаму асабліва важна выконваць рэкамендацыі стаматолага і своечасова здзяйсняць візіты для кантрольных аглядаў. Гэта дазволіць выявіць асаблівасці гаення і своечасова скарэктаваць схему лячэння.

Алена КРАВЕЦ.

КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона) извещает о проведении 21 апреля 2025 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. руб.)	Размер задатка (бел. руб.)	Расходы по изготовлению документации (бел. руб.)
1	**д. Чмелевичи, д. 12А;** 623282713601000036; целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1837	Черта населенного пункта, имеются сети: электрификации, подъездные пути, водоснабжение	3000,00	600,00	1874,38 + расходы на размещение объявления
2	**д. Фильяново, д. 28А;** 623282712601000035; целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2009	Черта населенного пункта имеются сети: электрификации, подъездные пути	2500,00	500,00	1702 + расходы на размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона 21 апреля 2025 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, 7А, Каменский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны: **8 (01774) 72 3 35, 72 3 81, (+37529) 1700261.**

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 16.04.2025 включительно.

Для участия в аукционе необходимо:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;
2. предоставить квитанцию об уплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Задаток перечисляется на р/с № BY42AKBB36006190711030000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Каменский сельский исполнительный комитет, код платежа – 4901.

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» составляет:

1. д. Фильяново, д. 28А составляет ориентировочно – **4070** бел. руб. (электроснабжение – 4070 руб.);
2. д. Чмелевичи, д. 12А, составляет ориентировочно – **4070** бел. руб. (электроснабжение 4070 бел. руб., водоснабжение 286 бел. руб.).

Возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам осуществляется на основании решения Логойского районного исполнительного комитета от 7 апреля 2020 г. № 858

БЕРАЖЫЦЕ СЯБЕ!

МАЛЕНЬКІ ЎКУС — ВЯЛІКАЯ НЕБЯСПЕКА

Кляшчы ўжо прачнуліся

Многія, выязджаючы на прыроду, баяцца ўкусу кляшчоў. І нездарма, бо гэтыя членістаногія часта пераносяць смяротна небяспечныя захворванні: энцэфаліт, хваробу Лайма, эрліхіёз і інш. Здавалася б, яшчэ холадна, асцерагацца няма чаго. Але гэтыя шкодныя насякомыя ўжо прачынаюцца, расказала намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Таццяна ВОЛКАВА:

— Сёння на тэрыторыі Беларусі рэгіструецца 12 відаў кляшчоў. Перыяд іх актыўнасці складае 10 месяцаў: з лютага па лістапад. Гэтыя павукападобныя з'яўляюцца пры тэмпературы ад 0 да +5° С. Наяўнасць паразітаў залежыць ад клімату. Павялічваецца колькасць цёплых дзён — пашыраецца і перыяд жыццядзейнасці кляшчоў. Цяпер вылучаецца два пікі актыўнасці членістаногіх: з канца мая да пачатку чэрвеня і з канца жніўня да пачатку верасня.

Як адзначыла Таццяна Валер'еўна, страхі, што клешч упадзе на вас з дрэва, беспадстаўныя. Самкі кляшчоў (а кусаюцца толькі яны) не паднімаюцца вышэй чым метр ад узроўню зямлі. Членістаногае жыве ў нізіннай расліннасці і валодае спецыяльнымі кручкамі на лапках, якімі і зачапляецца за ногі ахвяры. Таму на дачных участках рэкамендуецца скошваць траву і прыбіраць апалае лісце.

Што датычыцца захворванняў, якія пераносяць кляшчы, то, згодна з адпаведнымі даследаваннямі, амаль 35 % асобін паразіта нясуць адзін або некалькі патагенаў. У 1,8 % членістаногіх быў зарэгістраваны вірус клешчавога энцэфаліту, які выклікае запаленне абалонак галаўнога мозгу, паралічы і іншыя незваротныя для здароўя чалавека наступствы.

Але ўкусу кляшча можна пазбегнуць, упэўнена **загадчык супрацьэпідэмічнага аддзялення, урач-эпідэміёлаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Улада ЗАПОЛЬСКАЯ.**

> **Як адзначыла Таццяна Валер'еўна, страхі, што клешч упадзе на вас з дрэва, беспадстаўныя. Самкі кляшчоў (а кусаюцца толькі яны) не паднімаюцца вышэй чым метр ад узроўню зямлі. Членістаногае жыве ў нізіннай расліннасці і валодае спецыяльнымі кручкамі на лапках, якімі і зачапляецца за ногі ахвяры. Таму на дачных участках рэкамендуецца скошваць траву і прыбіраць апалае лісце.**

— Памылкова лічыць, што заразіцца ад кляшчоў можна толькі ў лесе ці на дачы, — папярэджвае яна. — Больш за 15 % укусаў адбываецца на тэрыторыі населеных пунктаў, зон адпачынку і паркавых участках. Каб пазбегнуць непажаданых наступстваў, варта правільна падбіраць вопратку. Неабходны рэчы светлых тонаў, галаўны ўбор, высокі абутак. Варта выключыць наяўнасць адкрытых участкаў цела.

> **Супраць укусаў кляшчоў могуць таксама дапамагчы спецыяльныя рэпеленты, якімі трэба апырскваць не толькі сябе, але і хатніх жывёл. Кожныя 30—40 хвілін варта праводзіць узаемаагляды адзення, а дома праверыць цела. Калі ўсё ж такі не ўдалося пазбегнуць укусу, то варта ў найбліжэйшы час выдаліць членістаногіх альбо самастойна, альбо звярнуцца ў арганізацыю аховы здароўя. Галоўнае — захаваць цэласнасць кляшча і поўнасцю дастаць яго са скуры.**

Месца ўкусу можна апрацаваць спіртавым растворам. Калі выдалілі кляшча самастойна, то варта як мага хутчэй звярнуцца да медыцынскіх супрацоўнікаў для агляду і прыняцця далейшых прафілактычных мер, — расказала ўрач-эпідэміёлаг.

Для дарослых і дзяцей распрацавана сістэма вакцынацыі, якая складаецца з дзвюх прышчэпак. Першую лепш рабіць восенню, а другую — праз паўгода. Ёсць і больш экстранная сістэма правядзення вакцынацыі, якая доўжыцца прыкладна 14 дзён. Але прышчэпкі ў любым выпадку лепш рабіць загадзя.

Хоць апошнім часам надвор'е даволі халоднае і хмарнае, сапраўдная вясна ўжо на падыходзе: хутка зноў будзе цёпла і сонечна. Але не трэба забываць, што да цяпла і сонца павылазяць усякія істоты, здольныя нанесці шкоду нашаму здароўю. Так што элементарная асцярога тут не перашкодзіць.

Марыя САМАЛЬ.

Извещение о проведении аукциона по продаже в частную собственность гражданам земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор аукциона – **Ивенецкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

№ п/п	Адрес, кадастровый номер участка	Площадь земельного участка, га	Характеристика инженерных коммуникаций	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток 20 % (бел. руб.)	Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. руб.)
1	д. Конопличи, 1Б, кадастровый номер 622084309101000044	0,2500	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	5700.00	1140.00	2424,99 + расходы на размещение информации в СМИ
2	д. Курдуны, 93, кадастровый номер 622084310301000154	0,1500	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	3500.00	700.00	2126,58 + расходы на размещение информации в СМИ
3	д. Курдуны, 95, кадастровый номер 622084310301000155	0,1500	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	3500.00	700.00	2111,78 + расходы на размещение информации в СМИ
4	д. Млынки, 1А, кадастровый номер 622084313101000017	0,2400	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	4000.00	800.00	2355,26 + расходы на размещение информации в СМИ
5	д. Млынки, 1Б, кадастровый номер 622084313101000018	0,2500	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	4000.00	800.00	2362,71 + расходы на размещение информации в СМИ
6	д. Млынки, 3А, кадастровый номер 622084313101000019	0,1850	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	4000.00	800.00	2303,70 + расходы на размещение информации в СМИ
7	д. Погорелка, 40Б, кадастровый номер 622084316101000077	0,139	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	4000.00	800.00	2515,13 + расходы на размещение информации в СМИ
8	д. Старинки, ул. Надречная, 1А, кадастровый номер 622084321601000101	0,1500	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	5000.00	1000.00	2015,40 + расходы на размещение информации в СМИ
9	д. Яновщина, 2Б, кадастровый номер 622084325601000025	0,2500	Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП	4500.00	900.00	2539,77 + расходы на размещение информации в СМИ

Аукцион состоится 23.04.2025 года (среда) в 10.00 по адресу: г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, 2-й этаж, зал заседаний.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **17.04.2025 года (включительно) до 17.00** по адресу: г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, кабинет управляющего делами исполкома.

Время работы: понедельник – пятница с 08.00 до 17.00 с обеденным перерывом с 13.00 до 14.00.

Вся информация размещена на сайте Воложинского райисполкома: **www.volozin.gov.by**

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь постоянно проживающим на территории Республики Беларусь в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Задаток в размере 20 % от начальной цены участка перечисляется на расчетный счет госказначейства № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа – 04901.

Для участия в аукционе организатору аукциона в срок, установленный в информационном сообщении о проведении аукциона, физические лица либо их представители представляют:

заявление на участие в аукционе по утверждаемой форме (представителями граждан — нотариально удостоверенная доверенность);

квитанцию об оплате задатка (оригинал).

При подаче заявления на участие в аукционе физические лица (представители физических лиц) предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его **копию.**

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня утверждения протокола.

222370, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, Минская область, Воложинский район, г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, контактный телефон (8 01772) 64-455.

Расчетный счет № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа – 04901

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, С'ЕЗДАЎ, ЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

«Звязда».
№ 52 — 20 сакавіка
1945 года

• На фронце

На працягу 18 сакавіка на паўднёвым захадзе ад Кёнігсберга нашы войскі вялі баі па знішчэнні ўсходне-прускай групы немцаў і, сціскаючы кальцо акружэння, занялі больш за 40 населеных пунктаў, у тым ліку Коршэнру, Патэрсорт, Людвігсорт, Шваніс, Рыпен, Лаўкітэн, Прэйсіш, Тыраў, Ленхефен, Малендорф, Рэфельд і іншыя.

Войскі 1-га Беларускага фронту, зламаўшы супраціўленне акружанага гарнізона немцаў, у гэты дзень авалодалі горадам і портам на Балтыйскім моры Кольберг. «**Як да цэнтра велізарнай павуціны зыходзяцца яе ніці, так зыходзяцца да Кольберга шматлікія шасейныя дарогі і чыгункі па ўсёй Памераніі. Сюды, да гэтага партовага горада на паўднёвым узбярэжжы Балтыйскага мора, сцягваліся з усходу тылы нямецкіх армій, рэшткі разгромленых варожых дывізій. Немцы спадзяваліся адсюдзецца за шматлікімі гарадскімі ўмацаваннямі пад прыкрыццём карабельнай артылерыі**», — пісала газета ў гэты дзень.

Паводле звестак, пасля цяжкіх і ўпартых баёў на бліжніх подступах да горада наша пяхота ўшчыльную падышла з захаду і пачала яго штурм. Прыкрываючыся ракой Перзантэ, немцы абаранялі гарадскія кварталы. Разгромлены варожы гарнізон спрабаваў выратавацца на суднах, але наша артылерыя абрушыла на порт масіўны агонь. «Баі перамясціліся ва ўсходнюю частку горада, — паведамляла «Звязда». — Савецкія часці ачысцілі ад праціўніка вуліцы на поўдні ад чыгункі, а потым распачалі рашучы штурм». Пасля жорсткіх вулічных баёў франтавікі зламалі супраціўленне варожага гарнізона і поўнасцю авалодалі горадам і портам.

У Чэхаславакіі, на захадзе і паўднёвым захадзе ад горада Зволен, нашы войскі ў выніку наступальных баёў занялі населеныя пункты Остра Лука, Шашоўске Падгроддзе, Горне Опатоўцэ, Глінік на Грон, Вігне.

На другіх участках фронту прадаўжаліся баі мясцовага значэння.

• У тыле

...Кожны дзень з Германіі прыбывалі цягнікі з савецкімі людзьмі, якія вярталіся з нямецкай няволі. «Звязда» пісала: «**На мінскім прыёмна-размеркавальным пункце яны атрымліваюць бясплатныя білеты на далейшы праезд, прадукты харчавання, грошы. Едуць рускія, украінцы, беларусы, едуць на Радзіму — на Кіеўшчыну, у Гомельскую, Маскоўскую, Ленінградскую, Сталінградскую і іншыя вобласці краіны, дзе пабывалі нямецкія акупанты**».

У вачах людзей, худых, знясіленых, змучаных, свяцілася радасць вызвалення — яны ехалі дамоў. У адным з артыкулаў наша газета размясціла расказы беларускіх грамадзян, якія вярнуліся з нямецкай няволі. Як страшны сон, народ успамінаў гэту фашысцкую катаргу.

«**Я не магу паверыць свайму шчасцю. Горш за жывёл абыходзіліся з намі немцы. Я працавала ва Усходняй Прусіі, недалёка ад горада Гольдан, у маёнтку бюргера Шульц. Цяжка расказаць, што перажыла я за гэты час. За малейшую правіннасць, а часта і без прычыны нас білі. Жылі мы ў бараку, побач са свінарнікам. Кармілі горш за свіней. Тое, што не з'ядалі яны, — аддавалася нам**», — успамінала Надзея Міхайлаўна Дзецькова, былая работніца саўгаса Магілёўскай вобласці.

З жудаснымі абставінамі сутыкнулася таксама 14-гадовая Ніна Карнеева з калгаса імя Варашылава Віцебскай вобласці. Дзяўчына расказвала, што ёй не было яшчэ 12 гадоў, калі немцы схапілі і пагрузілі ў халодныя таварныя вагоны: «**З размеркавальнага лагера ў горадзе Ісенбургу Ніна трапіла да немца, які абыходзіўся з дзецьмі па-зверску: працавалі па 16 гадзін, аралі зямлю, жалі і малацілі збожжа, цягалі каменні для будаўніцтва бруку. Аднойчы сястра дзяўчынкі, Надзя, стамілася ад працы, на хвілінку прысела — раззлаваны немец падбег да дзіцяці і стаў біць гумовай дубінкай. Абараняючыся крывёй, дзяўчынка страціла прытомнасць**», — пісала «Звязда».

Прывыкнуць да думкі, што зноў трапіла ў родны Мінск, не магла былая работніца завода «Чырвоная Зара» Ніна Старынская: «**Больш двух год прыйшлося прабыць мне на нямецкай катарзе. Па 17 гадзін штодзённа мы працавалі ў цэхах. За кожнымі 25 рабочымі стаяў наглядчык з гумавай дубінкай. Білі яны нас бязлітасна. На дзень мы атрымлівалі 200 грамаў сурагатнага хлеба, літр пахлёбкі з гнілой гародніны і шклянку вадкага кофе. Пасля цяжкага рабочага дня нас чакаў халодны барак з дзіравым дахам**».

У людзей, якія вярнуліся з нямецкага палону, гэтыя страшныя ўспаміны засталіся на ўсё жыццё. Яны працавалі на розных прадпрыемствах, у розных бюргераў, у сельскай гаспадарцы. І ўсе расказвалі і ўспаміналі аб страшэнных, нечалавечых умовах, аб катаржнай працы, аб голадзе, аб зверскіх пабоях і здзеках...

Вядучая рубрыкі
Яна ВАЛАСАЧ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по торгово-общественным помещениям в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» №№ 3.1,3.2 по г. п., торгово-общественные помещения №№ 5.1,5.2,5.3 по г. п.»

Сведения о застройщике

Застройщик: коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

Юридический адрес и местонахождение предприятия: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

Офис продаж: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

Режим работы офиса продаж: понедельник – четверг с 08.30 до 17.30, пятница с 08.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации:

- «Жилая усадебная застройка для многодетных семей в микрорайоне Сокол в г. Минске»;
- жилой дом № 4Д по ул. Семашко;
- жилой дом № 4Е по ул. Семашко;
- жилой дом № 21 по ул. Гризодубовой;
- жилой дом № 32 по ул. Ромашкина;
- жилой дом № 19 по ул. Гризодубовой;
- жилой дом № 26 по пр. Дзержинского;
- жилой дом № 13 по ул. Грушевской;
- жилой дом № 30 по ул. Ромашкина;
- жилой дом № 34 по ул. Ромашкина;
- жилой дом № 42 по ул. Щорса;
- жилой дом № 4В по ул. Семашко.

Информация об объекте строительства:

Цель строительства – возведение торгово-общественных помещений №№ 5.1, 5.2, 5.3 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» №№ 3.1, 3.2 по г. п., торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г. п.».

Строительство осуществляется на основании:

- актов выбора места размещения земельного участка от 06.03.2018, утвержденного председателем Мингорисполкома 13.03.2018; от 29.05.2019, утвержденного председателем Мингорисполкома 30.05.2019;
- свидетельства о государственной регистрации в отношении земельного участка: № 500/1864-1600 от 11.02.2021;
- решения Минского городского исполнительного комитета от 21.01.2021 № 140 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства», решения Минского городского исполнительного комитета от 29.04.2021 № 1336 «Об изменении решения Мингорисполкома от 21 января 2021 г. № 140»;
- проектно-сметной документации, прошедшей государственную экспертизу (заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 28.08.2020 № 368-15/20; изменение заключения государственной экспертизы от 22.01.2021 № 368-15/20-Д1; дополнение к заключению от 10.06.2022 № 271-15/22; дополнение к заключению от 24.08.2022 № 519-15/22);
- договора строительного подряда от 05.05.2022 № 361, заключенного с ОАО «Стройтрест № 35»;
- извещения от 06.04.2021 № 06/123 о получении уведомления о регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора от 06.04.2021 № 2-203Ж-013/21.

Сведения об этапах и сроках строительства:

Срок начала строительства – апрель 2021 года.

Предполагаемый срок завершения строительства и ввода в эксплуатацию – июль 2025.

Срок исполнения обязательств может быть изменен путем подписания дополнительных соглашений к заключенным договорам создания объектов долевого строительства по решению Мингорисполкома «Об изменении сроков строительства объектов строительства».

Здания встроенно-пристроенных торгово-общественных помещений – одноэтажные, без технического подполья и чердака. Конструктивная схема зданий – монолитный железобетонный рамно-связевый безригельный каркас. Стены и перегородки – кирпичные, монолитные железобетонные.

Кровли зданий – эксплуатируемые с покрытием из бетонной плитки. Торгово-общественные здания запроектированы на отм. -5,600 и включают помещения торгово-общественного назначения, загрузочную, санузлы (в том числе для ФОЛ), помещения уборочного инвентаря, технические помещения (венткамера, водомерный узел, электрощитовая). Высота торгово-общественных помещений от пола до низа выступающих конструкций – 3,3 м.

Входы в здания предусмотрены через тепловые тамбуры с уровня прилегающей территории.

Оконные и дверные блоки выполняются в системе витражей из алюминиевого профиля с остеклением двухкамерными стеклопакетами.

Система отопления – двухтрубная, горизонтальная, с установкой распределительных гребенок в каждом торгово-общественном помещении. Нагревательные приборы – стальные радиаторы.

Вентиляция – приточно-вытяжная с механическим побуждением движения воздуха.

В торгово-общественных помещениях запроектированы следующие системы: хозяйственно-питьевое (холодное и горячее) водоснабжение, бытовая канализация, внутренние водостоки.

Внутренняя отделка: стены и перегородки – штукатурка, полы – цементно-песчаная стяжка. Чистовая отделка помещений не предусмотрена. Санузлы оборудуются сантехническим оборудованием. Предусмотрена установка счетчиков горячего и холодного водоснабжения, учета электрической энергии и тепла.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, электрощитовая, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общего назначения, находящееся за пределами или внутри нежилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, элементы озеленения и благоустройства прилегающей территории. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации торгово-общественных помещений, которое передается организации (уполномоченному лицу, участникам совместного домовладения), осуществляющей управление общим имуществом совместного домовладения.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются торгово-общественные помещения № 5.1, 5.2, 5.3 по г. п., в том числе:

- **торгово-общественное помещение** площадью **223,50 кв. м** (включая 23,23 кв. м помещения загрузочной);
- **торгово-общественное помещение** площадью **285,94 кв. м** (включая 23,24 кв. м помещения загрузочной);
- **торгово-общественное помещение** площадью **286,73 кв. м** (включая 23,23 кв. м помещения загрузочной);
- **торгово-общественное помещение** площадью **289,45 кв. м** (включая 23,24 кв. м помещения загрузочной);
- **торгово-общественное помещение** площадью **233,56 кв. м.**

Стоимость 1 кв. м общей площади объекта долевого строительства в текущих ценах с учетом прогнозных индексов – **7 000,00 белорусских рублей с НДС.**

Строительство осуществляется согласно Указу Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере 30 % стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); для представителя – доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства **будут приниматься** и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди **с 08.30 24 марта 2025 года по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

Если граждании либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «Управление капитального строительства Запад» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках помещений и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44, (044) 559 33 91 и на сайте компании ukszapad.by**

АЛЁ НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

ПЕРАМОГА БУДЗЕ ЗА НАМІ

Неяк, здаецца, пад канец 90-х мінулага стагоддзя трапіў мне на вочы цікавы артыкул пра італьянскага фермера. У яго быў дойны статак на 600 галоў, які даглядалі ўсяго 13 чалавек, і сярэдні гадавы надой ад кожнай каровы — больш за дзесяць тысяч літраў...

Аднак больш за ўсё мяне ўразіла не гэта, а тое, што кіруе ўсім праўнук пісьменніка Льва Талстога Луіджы Альберціні.

Сельскагаспадарчых акадэмій ён не заканчваў, заатэхнію, ветэрынарыю ды шэраг іншых патрэбных навук спасцігаў самастойна, камп'ютары ўкараніў.

...Помню, як пераказваў гэта свайму цесцю Васілю Паўлавічу, як зацікаўлена той слухаў, бо і сам тады працаваў на малочнатаварнай ферме (прычым — адной з найлепшых у раёне!) з надоямі ў... тры тысячы літраў.

— А наконт дзесяці, — гарачыўся мой Васіль Паўлавіч, — я табе вось што скажу. Мы б іх таксама мелі, калі б нам ихнія машыны ды тыя камп'ютары. Пакуль жа...

Што «пакуль», мой цесць распавядаў з ранейшым запалам: што працуе ён «без выхадных і прахадных» за слесара, электрыка, механіка, ветэрынара, прычым усё — за адну зарплату... Што неяк раз махнуў быў у горад да сына. Усяго дзянёк там пабыў, пагасціў, паняньчыў унучку, а дамоў прыехаў — не паспеў парог пераступіць: жонка насустрач (яна ж — загадчыца фермы. — **Аўт.**) з умольным: «Ратуй, Васілёк! Транспарцёры паламаліся. Калі зараз жа не паправіць — жыжай заплывём!»

— Ну што было рабіць? — уздыхаў мой Паўлавіч. — Мігам пераадзеўся ды пабег ратаваць. І вось так, — працягваў, — ледзь не кожны дзянёк. Не паверыш: не было калі зубы ўставіць! Неяк раз, помню, у райцэнтр павезлі на так званы прафагляд. Ну, думаю, хоць трохі адпачну. Ды дзе там! Жонка ледзь не следам за мной машыну прыслала. Шафёру загадала, каб куляй на ферму даставіў — першацёлка абрадзіцца сабралася... Я з рэнтгена без майкі выскачыў, на хаду адзяваюся — да машыны бягу. Людзі глядзяць як на шызанутага... Але ж я паспеў — тое цялятка выратаваў...

— А цяпер ты мне скажы, — прапануе нарэшце мой цесць-«ратавальнік». — Твой італьянец змог бы так працаваць?

— Ды хто ж яго ведае? — паціскаю плячыма.

— Я, я ведаю! — рашуча заяўляе Паўлавіч. — Апошні зуб даю: больш за тры дні ён не пратрымаўся б, рады не даў! Так што звольнілі б яго падчыстую: не паглядзелі б, што праўнук Талстога.

З. Марозаў,
г. Мінск.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 235

З 23 студзеня да 2 лютага ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках праходзілі чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. У мужчынскім чэмпіянаце спаборнічалі 14 спартсменаў. Больш паловы ўдзельнікаў прэтэндавалі на перамогу. Упершыню чэмпіёнам Беларусі стаў малады грасмайстар Аляксей Куніца — 20 ачкоў. Ён здолеў апярэдзіць яшчэ шэсць міжнародных грасмайстраў, з якіх тры чэмпіёны свету розных гадоў. Дзейны чэмпіён свету Ігар Міхальчанка ўступіў пераможцу толькі па дадатковых крытэрыях. Бронзавы медаль выйграў малады майстар Марат Леў — 19 ачкоў. У жанчын сярод 12 удзельніц перамагла дзейная чэмпіёнка Еўропы Вікторыя Нікалаева — 19 ачкоў. Сярэбраны медаль у майстра Яўгеніі Швед — 18 ачкоў, якая лідзіравала большую частку дыстанцыі. «Бронза» ў міжнароднага майстра Паліны Петрусёвай — 17 ачкоў. Паглядзіце цікавыя прыклады гульні.



№ 15 У. Валюк — Л. Шур.

Белыя простыя: a1, c1, e1, g1, b2, d2, f2, a3, f4, h4, e5 (11)

Чорныя простыя: h2, c5, b6, d6, h6, c7, e7, g7, b8, d8, f8 (11)

У самым пачатку партыі белыя здолелі трапіць у дамкі. Пакажыце шлях да перамогі.

Цікава праходзіла наступная партыя.

№ 16 І. Міхальчанка — Д. Нікіценка.

Спачатку трэба расставіць пазіцыю паводле лёсавання e3>f4 h8>g5, затым пачынаецца гульня 1. g3-h4 g5xe3 2. f2xd4 d6-e5 3. a3-b4 h6-g5 4. h2-g3 g7-h6 5. b2-a3 g5-f4 6. g1-h2 b6-a5 7. d4-c5 ! c7-d6 8. c3-d4 e5xc3 9. g3xg7 h6-g5 10. h4xf6 e7xg5 11. c5xe7 d8xh8 12. d2-e3 c3-d2 13. e1xc3 b8-c7 14. b4-c5 2-0

№ 17 М. Леў — А. Валюк.

Белыя простыя: a1, c1, g1, d2, f2, h2, e3, d4, f4 (9)

Чорныя простыя: a3, g5, d6, h6, a7, c7, e7, g7, b8 (9)

Белыя з дапамогай пагроз дабіліся перамогі 1. f2-g3! e7-f6 2.d2-c3 d6-e5 3.f4:d6 c7:e5 4.g3-h4 e5-f4 5.g1-f2 f4:b4 6.d4-e5 f6:d4 7.h4:h8 b4-c3 8.h8-f6 h6-g5 9.f6:h4 a3-b2 10.c1:a3 c3-d2 11.h4-g5 +

№ 18

Белыя простыя: e1, d2, a3, c3, g3, f4, a7 (7)

Чорныя простыя: f2, h2, d4, h4, e5, d6, c7, e7, g7 (9)

№ 19

Белыя простыя: c1, e1, a3, g3, f4, a5, h6 (7)

Чорныя простыя: b2, h2, d4, g5, d6, a7, f8 (7)

Наступныя кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі па правілах бразільскіх шашак (як у шашкі — 100).

№ 20

Белыя простыя: a1, e1, d2, h2, e5, g5 (6)

Чорныя простыя: b2, c3, b4, b6, b8 (5)

№ 21

Белыя простыя шашкі: a1, e1, d2, f4, e5, f6, h6 (7)

Чорныя простыя шашкі: b2, c3, b4, d4, h4, b6, b8, h8 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс. З 14 да 16 сакавіка адбудзецца VI Адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Орша-2025». Даведкі па тэл. +375 29 298 00 34.

З 21 да 23 сакавіка ў Слоніме адбудуцца традыцыйныя рэспубліканскія спаборніцтвы па шашках-64, прысвечаныя памяці братоў Мялешкаў і Мікалая Крата. Заяўкі па тэл.: +375 29 115 18 30 (А1), +375 33 375 18 30 (МТС), a.aniskal959@gmail.com Палажэнне аб спаборніцтвах на сайце БФШ https://belarus.fmjd.org/

Праверце свае рашэнні: выпуск № 234 ад 14.02.2025.

№ 8 1...g7-f6 2. f4-e5 d4-e3! [у партыі чорныя зрабілі пройгрышны ход. 2...d4-c3? 3. e5:g7 +] 3. f2:d4 b8-a7 4. e5:g7 a7:e3 =

№ 10 1...g7-h6 2. e1-f2?? c7-b6? [абодва гульцы не заўважылі просты ўдар 2...d4-c3! 3. d2:d6 c7:e1 x] 3. a5:c7 b8:d6 4. d2-e3! d8-c7 5. a3-b4 c5:a3 6. e3:c5 d6:b4 7. c1-b2 a3:g5 8. h4:c3+

№ 11 1. c1-d2? b6-c5! 2. d4:b6 a7:c5x

№ 12 1. 31-26 11-17 (1...24-30 2. 35:33 23-28 3. 32:12 21:34 4. 40:29 08:39 5. 29-24 19:30 6. 25:43=]

№ 13 1. d2-c3 e5:e1 2. c3:c7 b8:d6 3. b2-c3 e1:b4 4. a3:e7 f8:d6 5. a7-b8 d6-c5 6. b8-e5+

№ 14 1. g3-f4 e5:e1 2. g7:c3 e1:b4 3. a5:c3+

Першымі дакладныя адказы даслалі: І. Ананіч (Гродна), В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец).

Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013 e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

19 САКАВІКА Даты Падзеі Людзі

У краіне

1917 год — у Мінску прайшла шматтысячная агульнагарадская маніфестацыя з удзелам войскаў Заходняга фронту ў падтрымку Лютаўскай рэвалюцыі.

1944 год — савецкія войскі вызвалілі вязняў Азарыцкага і іншых канцлагераў смерці на Гомельшчыне. Нямецка-фашысцкія захопнікі ў пачатку сакавіка 1944 года стварылі тры лагеры смерці ў былым Даманавіцкім раёне, недалёка ад пярэдняга краю абароны ў г. п. Азарычы, вёсках Дзярць і Падасіннік. Пад выглядам эвакуацыі сюды было дастаўлена больш за 50 тысяч грамадзян. Сярод вязняў гітлераўцы змясцілі хворых сыпным тыфам з мэтай распаўсюдзіць эпідэмію на наступаючыя часці Чырвонай Арміі. Палонных марылі голадам, змушалі піць балотную ваду, ім забаранялі паліць вогнішчы. Любая форма пратэсту каралася масавымі расстрэламі. Калі чырвонаармейцы адчынілі вароты лагера, то сваіх збавіцеляў сустрэлі толькі 33 480 чалавек.

У свеце

1710 год — у Англіі прыняты закон «Статут каралевы Ганны» — першы ў свеце закон аб абароне аўтарскага права. Сутнасць гэтага закона заключалася ў тым, што ён забараняў тыражаваць творы без згоды аўтара. Таксама ўстанаўліваліся забарона на тыражаванне твора аўтара без яго згоды тэрмінам на 14 гадоў.

1900 год — нарадзіўся Фрэдэрык Жаліо-Кюры, французскі фізік і грамадскі дзеяч, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы. Разам з Ірэн Жаліо-Кюры адкрыў штучную радыеактыўнасць. Удзельнік Руху Супраціўлення ў Францыі. Першы старшыня Сусветнага Савета Міру.

1924 год — нарадзіўся Леў Аляксандравіч Куліджанаў, савецкі кінарэжысёр, сцэнарыст, педагог, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Паставіў фільмы «Дом, у якім я жыву», «Бацькоўскі дом», «Калі дрэвы былі вялікімі», «Злачынства і пакаранне» і іншыя. Лаўрэат Ленінскай прэміі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 382000000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 291. Індэкс 63850. Зак. № 643.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 сакавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12